Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЖНІЎНЯ 2021 г. СЕРАДА № 147 (29516)

ІМІДЖ З НАДЗЕЯЙ НА БУДУЧЫНЮ 8

УПАЎ, АПРЫТОМНЕЎ – ГІПС... 9

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«На сёння збожжавыя ў краіне ўбраныя на 50,8 % плошчаў. Намалочана 3,5 млн тон збожжа пры ўраджайнасці 32 ц/га. Ва ўборцы ўдзельнічаюць 36 тысяч механізатараў. Падтрымліваем гатоўнасць тэхнікі на ўзроўні 97 %, самая высокая — у Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцях: 99 %. Гэта дае магчымасць пры добрых умовах надвор'я ўбіраць у дзень 4-6 % плошчаў. Калі надвор'е дазволіць штодня выводзіць камбайны ў поле, то Брэсцкая вобласць за 5-6 дзён уборку можа практычна завяршыць. У цэлым па краіне можна скончыць уборачную кампанію за 12-13 пагодлівых дзён».*

# Залучаныя на жніве

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кіроўца Вячаслаў КРАСУЦКІ наклейвае на свой самазвал знак «тысячніка».

**Брэнд Случчыны — гэта не толькі ўрадлівая зямля, але і дбайныя, руплівыя гаспадары на ёй. Хлебаробы «Аграфірмы «Лучнікі» плануюць атрымаць важкі каравай, і цяпер прыйшоў іх час — збіраць ураджай. Каля вёсак Лучнікі, Сярагі, Варкавічы, Падліпцы, Бязверхавічы — асноўныя палеткі прадпрыемства, там поўным ходам ідзе жніво. Некалькі дзён таму і мне давялося назіраць завяршальную — дажыначную стадыю спрадвечнага сялянскага клопату.** СТАР. 13

## КАРАТКА

- **На ўдзел у «Вялікай размове з Прэзідэнтам» паступіла ўжо больш за 300 заявак.**
- Сяргей Цяцерын падаў у адстаўку з пасады кіраўніка Беларускай тэніснай федэрацыі.
- **Беларусь запрасіла казахстанскі кантынгент для ўдзелу ў вучэннях «Захад-2021».**
- У Віцебскім раёне ў брацкай магіле перапахавалі астанкі больш як 80 салдат.
- **У Слуцкім раёне распачатыя дзве крымінальныя справы аб службовым падлогу пры справаздачнасці аб руху буйной рагатай жывёлы.**
- У Мінску пасля размоў з ілжэсупрацоўнікамі банка пенсіянерка пазбавілася больш за Br37 тысяч.
- **У Еўрасаюзе прызналі дзеючымі COVID-сертыфікаты Сан-Марына, дзе выкарыстоўваецца «Спадарожнік V».**
- Усіх жыхароў кітайскага Уханя праверацъ на COVID-19 для прадухілення новай успышкі.

ISSN 1990 — 763X

Транспарт

## Рэгістрацыйныя карткі для таксістаў

**А яшчэ нармальны рабочы дзень, адпачынак і права на «бальнічны»... Ці паўплываюць новаўвядзенні на тарыфы?**

**Намеснік міністра транспарту і камунікацый Беларусі Сяргей ДУБІНА падчас прэс-канферэнцыі падрабязна расказаў аб праекце новага ўказа Прэзідэнта «Аб пытаннях аўтамабільных перавозак пасажыраў».**

Як вядома, праект указа быў вынесены на грамадскае абмеркаванне ў апошняй дэкадзе ліпеня. «Мэта гэтага дакумента — забеспячэнне бяспекі перавозак пасажыраў, стварэнне ўмоў для добрасумленнай канкурэнцыі і павышэнне якасці паслуг, якія аказваюцца насельніцтву», — сказаў Сяргей Дубіна.

Паводле звестак Транспартнай інспекцыі, за мінулы год з удзелам перавозчыкаў таксі адбылося 76 дарожна-транспартных здарэнняў, пацярпелі 92 чалавекі. І, што найбольш сумна, загінулі 16 чалавек. Акрамя таго, цяпер асобныя нядобрасумленныя перавозчыкі з мэтай атрымання канкурэнтных пераваг выкарыстоўваюць незаконныя схемы па арганізацыі і выкананні перавозак. СТАР. 4

Векапомнае

## МАКСІМАЛЬНА ПРАЎДЗІВА

**Ваенныя гісторыкі — аб дыскрэдытацыі подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, выяўленні новых фактаў і захаванні памяці**

**Тая вайна даўно стала мінулым, напоўненым як трагічнымі, так і гераічнымі падзеямі. Аднак дагэтуль не сціхаюць спекуляцыі на тэму ролі савецкага народа ў перамозе над фашызмам, а рэальныя факты набываюць новую інтэрпрэтацыю. Праблему супрацьдзеяння фальсіфікацыям гісторыі Другой сусветнай вайны, а таксама пытанне захавання гістарычнай памяці абмеркавалі падчас круглага стала «Каб памяталі. Апошняя ваенная аперацыя на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне заходніх рубяжоў краіны», які днямі адбыўся ў прэс-цэнтры Дома прэсы.**

### СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ФАЛЬСІФІКАЦЫЯМ

Як адзначыў **рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Марат ЖЫЛІНСКІ,** гісторыкі, у тым ліку школьныя настаўнікі, павінны максімальна праўдзіва паказваць падзеі ваенных гадоў на тэрыторыі Беларусі. «Апошнім часам адбываюцца вельмі сур'ёзныя нападкі на нашу краіну, інсінуацыі, фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, — канстатуе эксперт. — Да гэтага трэба адносіцца вельмі агрэсіўна. Мы ў апошнія гады сябе заспакоілі, палічылі, што мы такія памяркоўныя, у нас такая гісторыя, таму ніхто нас не кране. Яшчэ як крануць». СТАР. 5

Тэндэнцыі

# ЗБАЛАНСАВАНА І АПЕРАТЫЎНА

## Фінансаваму сектару Беларусі ўдаецца супрацьстаяць знешнім і ўнутраным шокам

**Пра гэта заявіў начальнік упраўлення фінансавай стабільнасці Нацыянальнага банка Ігар МАГІЛЕВІЧ на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацбанка, паведаміла БелТА.**

### НАСУПЕРАК САНКЦЫЯМ

«Фінансавы сектар Беларусі ўжо больш за пяць кварталаў функцыянуе ў стрэсавых умовах. Сярод асноўных пагроз фінансавай стабільнасці на першы план сёлета вылучыліся нарастаючы санкцыйны ціск і няўстойлівасць рэсурснай базы банкаў. Тым не менш фінансаваму сектару краіны ўдаецца супрацьстаяць знешнім і ўнутраным шокам. Ключавыя паказчыкі фінансавай стабільнасці ў першым паўгоддзі 2021 года знаходзіліся ў прымальных дыяпазонах», — заўважыў Ігар Магілевіч. Паводле яго слоў, нарматывы бяспечнага функцыянавання банкамі і ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» у цэлым выконваліся. «Захоўвалася ўстойлівая работа страхавога сектара, лізінгавых арганізацый і сектара іншых фінансавых пасрэднікаў. Забяспечана стабільнае і бесперабойнае функцыянаванне плацежнай сістэмы краіны. Узровень сістэмных рызык не перавышае крытычнай адзнакі. Забяспечваецца плацежаздольнасць і ліквіднасць банкаў. Пакрыццё нарматыўным капіталам прынятых банкамі рызык у першым паўгоддзі 2021 года застаецца на высокім узроўні. Дастатковасць нарматыўнага капіталу па банкаўскім сектары складае 18,3 % і істотна перавышае мінімальна дапушчальны ўзровень», — падкрэсліў прадстаўнік Нацбанка.

Рэнтабельнасць актываў з пачатку года павялічылася на 0,3 працэнтнага пункта — да 1,5 % па стане на 1 ліпеня. Таксама вырасла рэнтабельнасць нарматыўнага капіталу банкаў. Прыбытак банкаўскага сектара за першае паўгоддзе склаў каля Br763 млн, перавысіўшы на Br339 млн прыбытак за аналагічны перыяд папярэдняга года. Такі рост прыбытку быў забяспечаны расфарміраваннем банкамі спецыяльных рэзерваў, якія знізіліся на Br528 млн.

Фінансавы сектар працягне збалансавана і аператыўна рэагаваць на ўзнікаючыя пагрозы. «Вядома, прадказаць новыя шокі, іх чарговасць і маштаб вельмі складана. Многія фактары знаходзяцца па-за сферай уплыву Нацбанка. Аднак рэгулятар пільна сочыць за развіццём сітуацыі ў эканоміцы і на фінансавых рынках. Аналізуюцца магчымыя рызыкі і слабыя месцы фінансавай сістэмы, знешнія пагрозы фінансавай стабільнасці», — адзначыў Ігар Магілевіч.

### ІНФЛЯЦЫЯ ЗАПАВОЛІЦЦА

Нацыянальны банк прагназуе інфляцыю па выніках года на ўзроўні 9 %. Пра гэта паведаміў **член праўлення, начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацбанка Дзмітрый МУРЫН**.

«У існуючых умовах чакаецца, што па выніках III квартала гадавая інфляцыя захаваецца паблізу ўзроўню, які склаўся ў чэрвені (9,9 % — **БелТА**). У наступным інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў запаволіцца: па выніках 2021 года прырост спажывецкіх цэн ацэньваецца каля 9 %. Чакаецца, што да канца 2022-га інфляцыя ў гадавым вымярэнні наблізіцца да 6 %. Усё гэта прадвызначае неабходнасць працягу сумеснай работы ўрада і Нацыянальнага банка па далейшым запаволенні інфляцыі і замацаванні яе ў сярэднетэрміновай перспектыве на ўзроўні паблізу 5 %», — сказаў Дзмітрый Мурын. Паводле яго слоў, цяперашнія падыходы да рэалізацыі манетарнай палітыкі ў найбліжэйшы час захаваюцца. «Нацыянальны банк забяспечыць нацэленасць сваіх інструментаў на стрымліванне інфляцыйных працэсаў і забеспячэнне макраэканамічнай збалансаванасці. Акрамя таго, дзеянні Нацбанка будуць скандэнтраваныя на аднаўленні рэсурснага патэнцыялу банкаўскага сектара шляхам фарміравання ўмоў, накіраваных на ўмацаванне даверу да нацыянальнай валюты і павелічэнне ашчаднай актыўнасці эканамічных суб'ектаў. Тым самым будуць фарміравацца ўмовы для падтрымкі аднаўлення тэмпаў эканамічнага росту. У сукупнасці дадзеныя падыходы дазволяць стрымаць інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў і забяспечыць збалансаванае развіццё беларускай эканомікі», — адзначыў прадстаўнік Нацбанка.

### ЯК ПЕРАМАГЧЫ КІБЕРЗЛАЧЫНЦАЎ?

У Беларусі распрацоўваецца праект указа аб супрацьдзеянні махлярству ў банкаўскім сектары, паведаміў Ігар Магілевіч. Такія меры звязаны з тым, што ў Беларусі на працягу апошніх гадоў назіраецца значны рост злачынстваў, звязаных з крадзяжом грашовых сродкаў з дапамогай выкарыстання дыстанцыйных каналаў абслугоўвання кліентаў банкаў. Агульная колькасць кіберынцыдэнтаў у банкаўскай сферы сёлета за першае паўгоддзе павялічылася больш чым у чатыры разы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, галоўным чынам за кошт росту колькасці выпадкаў з выкарыстаннем метадаў сацыяльнай інжынерыі. Метадам, які найбольш актыўна выкарыстоўваўся ашуканцамі, стаў вішынг.

Для аператыўнага абмену інфармацыяй Нацбанк рэалізуе праект па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы апрацоўкі інцыдэнтаў інфармацыйнай бяспекі. «Патрабуецца актыўны ўдзел банкаўскай супольнасці па інтэграцыі банкаўскіх сістэм з аўтаматызаванай сістэмай. Разам з тым для дасягнення выніку ў барацьбе з кіберзлачынствамі і зніжэння іх колькасці банкам неабходна забяспечыць выкананне рэкамендацый Нацбанка па супрацьдзеянні махлярству ў галіне электронных плацяжоў, а таксама павысіць узровень узаемадзеяння з падраздзяленнямі праваахоўных органаў па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій», — падкрэсліў Ігар Магілевіч.

Адным шляхам

# СТРАТЭГІЧНЫ РЭСУРС

## На форуме ШАС прынялі наньчанскую ініцыятыву

**Форум ШАС па традыцыйнай медыцыне — 2021 прайшоў у гарадской акрузе Наньчан, што ў правінцыі Цзянсу на паўднёвым усходзе Кітая.**

Гэта адно з важных мерапрыемстваў, прысвечаных 20-годдзю стварэння Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Тэма форуму — «Захаванне пераемнасці, інавацыйнае развіццё, узаемнае ўзбагачэнне, сумеснае выкарыстанне». Арганізатарамі выступілі Кітайскі камітэт ШАС па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве, Дзяржаўнае ўпраўленне па справах традыцыйнай медыцыны КНР і Народны ўрад правінцыі Цзянсу.

Каля 500 прадстаўнікоў з Кітая і дзяржаў — членаў ШАС узялі ўдзел у маштабным мерапрыемстве ў змяшаных фарматах «анлайн + афлайн». Як заўважыў у сваім відэазвароце **першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ**, пандэмія каранавіруса стала сур'ёзным выклікам для сусветнай супольнасці. У пераадоленні яе наступстваў не павінна быць месца палітыцы, рознагалоссям. Згуртаванасць — галоўная місія міжнародных арганізацый. Адным з яскравых прыкладаў гэтага з'яўляецца дзейнасць ШАС. Удзельнікі дадзенай арганізацыі аказваюць адзін аднаму належную падтрымку. Адметным у плане пераадолення наступстваў пандэміі каранавіруса з'яўляецца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, якое падкрэслівае ўзорны характар канструктыўнага ўзаемадзеяння краін. Як нагадаў Мікалай Снапкоў, летась наша дзяржава першая ў свеце аказала гуманітарную дапамогу Паднябеснай у барацьбе з ковідам. Такія грузы пастаўляліся неаднойчы. Кітай, у сваю чаргу, падставіў плячо дапамогі Беларусі.

У тым ліку незаменным рэсурсам сталі магчымасці традыцыйнай кітайскай медыцыны (ТКМ). Як вядома, цэнтры ТКМ адкрытыя ва ўсіх абласцях. Прымяненне адпаведных працэдур прадэманстравала высокую тэрапеўтычную эфектыўнасць. Як адзначыў Мікалай Снапкоў, сімвалічна, што цэнтрам распаўсюджвання сусветна прызнанага вопыту ТКМ стаў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Сёлета ў лютым тут быў падпісаны мемарандум паміж Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь, Інстытутам культуры і эканомікі Цзіньтаа і Кітайскай карпарацыяй інжынірынгу САМС. Новае прадпрыемства-рэзідэнт ТАА «Новаэра Біятэх» створана пры ўдзеле Інстытута культуры і эканомікі Цзіньтаа, клінікі кітайскай медыцыны і кампаніі фармацэўтычных тэхналогій Сішаньцінсюэ (Пекін). На першым этапе плануецца арганізаваць вытворчасць медыцынскіх прэпаратаў для лячэння каранавіруса. Таксама прадугледжана стварэнне Еўразійскага цэнтра традыцыйнай кітайскай медыцыны для абмену вопытам, дыягностыкі і лячэння захворванняў.

Чарговы крок супрацоўніцтва ў медыцынскай галіне — кітайска-беларуская зона паглыбленага супрацоўніцтва і міжнародны парк традыцыйнай кітайскай медыцыны і аховы здароўя. У канцы ліпеня ў «Вялікім камені» было падпісана адпаведнае пагадненне. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел кіраўніцтва Дэпартамента Еўразіі Міністэрства камерцыі КНР, Пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь, УП «Цэнтр экспертызы і выпрабаванняў у ахове здароўя», Адміністрацыі і Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка, а таксама кіраўніцтва профільных ведамстваў горада Цындаа і прадстаўнікі ствараемага праекта з ААТ «Кітайская карпарацыя інжынірынгу САМС», Інстытута культуры і эканомікі Цзіньтаа і Zhongheng Glory (Beijing) Technology Co., Ltd.

У інфармацыйнай прасторы шмат напісана аб выкарыстанні разам з некаторымі вядомымі супрацьвіруснымі прэпаратамі і травяных формул ТКМ для лячэння пацыентаў з COVID-19. Гаворка ідзе аб прыродных лекавых сродках, якія стымулююць імунітэт. Гаа Сяоцюнь, прадстаўнік Пекінскай камісіі па ахове здароўя, заявіў, што ТКМ унесла значны ўклад у выздараўленне пацыентаў. «Традыцыйная кітайская медыцына адыгрывае актыўную ролю ў павышэнні хуткасці выздараўлення і зніжэнні ўзроўню смяротнасці сярод пацыентаў», — заўважыў эксперт. Як вядома, падчас эпідэміі COVID-19 каля пяці тысяч урачоў з многіх клінік і бальніц ТКМ былі накіраваны ў правінцыю Хубэй для ўдзелу ў лячэнні пацыентаў. Яны прыгатавалі на месцы дзясяткі тысяч доз адвараў з зёлак.

Так што рэсурс насамрэч стратэгічны, і асабліва на фоне выклікаў часу, звязаных з пандэміяй каранавіруса. На форуме была прынята «Наньчанская ініцыятыва аб развіцці супрацоўніцтва». У ёй адзначаецца, што традыцыйная медыцына (ТМ) адыграла актыўную ролю ў глабальнай барацьбе з пандэміяй і служыць апорай для аховы здароўя народаў краін свету. Дзяржавы — члены ШАС ажыццяўляюць шырокі абмен і супрацоўніцтва па падрыхтоўцы кадраў, у галіне медыцынскіх і навуковых даследаванняў і засваенні рэсурсаў лекавых траў.

Падыходы ТМ, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, маюць вялікае значэнне для ўдасканалення і развіцця нацыянальных медыцынскіх праграм. Краіны імкнуцца да больш цеснай інтэграцыі традыцыйнай медыцыны з сучаснай. Наньчанская ініцыятыва прадугледжвае актыўнае прасоўванне даследаванняў ролі ТМ у захаванні здароўя і ў прадухіленні, дыягностыцы, лячэнні фізічных і псіхалагічных захворванняў, паляпшэнні стану. Гэта робіцца дзеля таго, каб традыцыйная медыцына працавала больш бяспечным і эфектыўным чынам. На прасторы ШАС плануецца выяўляць унікальныя перавагі традыцыйнай медыцыны ў супрацьдзеянні такім агульным выклікам, як хранічныя захворванні, успышкі новых эпідэмій.

Варта развіваць супрацоўніцтва ў галіне выкарыстання лекавых траў у традыцыйнай медыцыне. Неабходна стымуляваць практыку па навучанні ў дадзенай сферы і падрыхтоўцы прафесійных работнікаў, нарошчваць абмены паміж пастаўшчыкамі і гандаль адпаведнымі паслугамі. Як адзначаецца ў ініцыятыве, інавацыя традыцыйнай медыцыны аказвае пазітыўны ўплыў на прагрэс сусветнай цывілізацыі. У яе бясспрэчных перавагах удзельнікі форуму маглі пераканацца самастойна. Яны наведалі вытворчую базу «Даліны лекаў» карпарацыі Цзянчжун, а таксама навукова-інавацыйную зону па традыцыйнай кітайскай медыцыне горада Наньчан.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Шок

# Літва «зляцела з катушак»

## Суседняя краіна пачала прымусовую дэпартацыю бежанцаў

**Учора ў сецыве з'явіліся шакавальныя кадры: мігранты распавялі пра абставіны дэпартацыі з суседняй дзяржавы.**

Бежанцаў з Ірака і Камеруна жорстка збілі дубінкамі і прыкладамі літоўскія пагранічнікі (ім «дапамагалі» кінолагі ваеннай паліцыі з сабакамі), якія выкарыстоўвалі і электрашокеры. У небарак адабралі грошы і мабільныя тэлефоны. Жанчын абступілі і пачалі збіваць нагамі. Прымусовую дэпартацыю пацвердзіў намеснік міністра ўнутраных спраў Літвы Арнольдас Абрамавічус. Ён заявіў, што «ўжыванне сілы супраць мігрантаў на граніцы будзе залежаць ад іх паводзін. Пагранічнікі могуць выкарыстоўваць усе неабходныя меры, каб спыніць нелегальную міграцыю». Раней стала вядома, што кіраўнік МУС Літвы Агнэ Білатайтэ падпісала загад, які дазваляе супрацоўнікам службы аховы граніцы прымяняць не толькі псіхалагічны, а і фізічны гвалт супраць мігрантаў.

Органы пагранічнай службы зафіксавалі перасячэнне граніцы мігрантамі з тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі. Пра гэта БелТА паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ**. «За апошнія суткі каля сарака замежнікаў было гвалтоўна вытурана прадстаўнікамі сумежнага боку ў Беларусь. Указаныя грамадзяне маюць прыкметы цялесных пашкоджанняў рознай ступені цяжкасці, а таксама знаходзяцца ў прыгнечаным маральна-псіхалагічным стане. Сярод іх ёсць жанчыны і дзеці, у дачыненні да якіх таксама ўжывалася фізічная сіла», — распавёў Антон Бычкоўскі.

Паводле яго слоў, пацярпелым аказваецца ўся неабходная дапамога з прыцягненнем спецыялістаў, праводзяцца мерапрыемствы па высвятленні ўсіх абставін. «Мы лічым недапушчальным выкарыстоўваць такія метады і спосабы ў дачыненні да ўразлівых асоб, а тым больш жанчын і дзяцей. Такія дзеянні груба парушаюць правы чалавека і падлягаюць расследаванню кампетэнтнымі органамі, у тым ліку міжнароднымі», — дадалі ў Дзяржпагранкамітэце.

Варта згадаць, што, згодна з артыкулам 7 Рымскага статута Міжнароднага крымінальнага суда ад 17 ліпеня 1998 года, «дэпартацыя або гвалтоўнае перамяшчэнне насельніцтва» адносяцца да ліку злачынстваў супраць чалавецтва і цягнуць міжнародную крымінальную адказнасць.

**Пётр ДУНЬКО.**

### ❍ У тэму

### ПАЛІЦЭЙСКІ ГВАЛТ, КАЛЮЧЫ ДРОТ І ВАРОЖАСЦЬ

Беларусь і многія дзяржавы Еўропы адчуваюць рост міграцыйных патокаў, але стогне і патрабуе салідарнасці толькі Літва. Пра гэта гаворыцца ў адказе **прэс-сакратара МЗС Беларусі Анатоля ГЛАЗА** журналістам, які размешчаны на сайце ведамства.

«Мігранты бягуць з разбураных вайной раёнаў у надзеі знайсці свой новы, цёплы, утульны, а галоўнае — бяспечны дом, а натыкаюцца на паліцэйскі гвалт, спіраль Бруна (віткі калючага дроту. — **Рэд.**) і адкрытую варожасць. Рост міграцыйных патокаў Беларусь адчувае і на сабе: нашы пагранічнікі ў апошні час затрымалі значна больш нелегалаў, чым раней. Многія дзяржавы Еўропы, у тым ліку якія не маюць знешніх граніц, таксама фіксуюць у сябе рост колькасці нелегалаў. Але стогне і патрабуе салідарнасці толькі Літва», — звярнуў увагу Анатоль Глаз.

У беларускім МЗС выказалі здагадку: можа быць, уладам Літвы выгадна такое становішча спраў? «І ў гэтым кантэксце нам цалкам зразумелыя справядлівыя пытанні, якія літоўская грамадскасць цалкам абгрунтавана ставіць свайму ўраду. Затое высокі прадстаўнік ЕС за пафасныя фразамі аб правах чалавека і салідарнасці актыўна ўтойвае відавочныя факты «дэмакратычных» разгонаў мірных акцый пратэсту з празмерным выкарыстаннем сілы, а таксама выправаджэння мігрантаў з Літвы, уключаючы цяжарных жанчын і дзяцей, з ужываннем зброі», — адзначыў прэс-сакратар міністэрства.

Мабыць, гэта той самы выпадак, калі нехта спрабуе перакласці свае праблемы з хворай галавы на здаровую, і Еўрасаюз нязграбна спрабуе выкарыстаць сітуацыю на беларуска-літоўскай мяжы для дэманстрацыі адзінства і салідарнасці, падкрэсліў Анатоль Глаз. «За гады нашай незалежнасці мы неаднойчы на справе пацвярджалі, што беларускія пагранічныя службы заўсёды адказна падыходзяць да сваіх міжнародных абавязацельстваў і да аховы рубяжоў сваёй краіны. Беларусь заўсёды была і застаецца адкрытай да канструктыўнага супрацоўніцтва і дыялогу для вырашэння любых наяўных складаных пытанняў», — падсумавалі ў знешнепалітычным ведамстве.

Прыёмная кампанія — 2021

# Патрабуюцца фізікі і матэматыкі

## У БДУ аб'яўлены дадатковы набор на бюджэтную форму атрымання адукацыі

**На дзённай форме навучання засталіся вакантныя 36 месцаў.**

На механіка-матэматычным факультэце — 14 месцаў: 8 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)» і 6 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-канструктарская дзейнасць)».

На фізічным факультэце абітурыентаў чакаюць 11 месцаў: 5 — на спецыяльнасці «Фізіка (напрамак — вытворчая дзейнасць)» і 6 — на спецыяльнасці «Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій».

У Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце БДУ імя А. Д. Сахарава пасля залічэння засталіся незапоўненыя 11 месцаў: 4 — на спецыяльнасці «Прыродаахоўная дзейнасць», 4 — на спецыяльнасці «Энергазэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент» і 3 — на спецыяльнасці «Ядзерная і радыяцыйная бяспека».

На завочнай форме навучання засталіся свабодныя 15 бюджэтных месцаў на механіка-матэматычным факультэце: 5 — на спецыяльнасці «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)» і 10 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)».

Дакументы будуць прымацца да 18 гадзін 7 жніўня па адрасе: Мінск, вуліца Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Алімпійскі дзённік

# ТРЭНІРОЎКА АПТЫМІЗМУ

**Алімпійскія гульні ў Токіа праходзяць з уласцівай ім драматычнасцю. І пакуль беларусы працягваюць змагацца за медалі, алімпійскі чэмпіён Іван Літвіновіч вярнуўся ў Мінск, дзе яго ў святочнай атмасферы сустрэлі кіраўніцтва, сябры і паклоннікі. «Адчування, што алімпійскі чэмпіён, пакуль няма, можа, яшчэ з'явіцца. Планы — дадому дабрацца, адпачыць пару дзён, потым паглядзім», — сказаў Іван Літвіновіч журналістам.**

**ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ.** Затаіўшы дыханне, усе чакалі медаля ад Марыны Літвіновіч і Вольгі Худзенкі, якія выступалі ў фінальных заездах байдарак-двоек на 500 м. Спартсменкі выступілі з вынікам 1 хвіліна 37,647 секунды. Гэтага хапіла толькі для шостага месца ў выніковым пратаколе.

Яшчэ адзін лідар каманды Алег Юрэня ў фінале «В» спаборніцтваў байдарак-адзіночак паказаў 4-ы вынік і заняў на Алімпіядзе 12-е месца.

«Беларускія весляры выступілі ў двух фіналах, засталіся без узнагарод, але пасыпаць галаву попелам не варта. Вынікі цесныя, многія каманды-фаварыты пакуль без узнагарод. Хоць новазеландкі, прызнаю, — прыгажуні! Кубінцы як прыгожа ў каноэ выйгралі! Турнір у Токіа толькі стартаваў, чакаем жаночую байдарку ў адзіночцы на 500 м, на 1000 м байдарку-двойку ў мужчын. Алена Наздрова пачне 4 жніўня кваліфікацыю ў каноэ на 200 м. Гульні працягваюцца, і далей тут, на вяслярным канале, будзе яшчэ цікавей», — адзначыў **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Уладзімір ШАНТАРОВІЧ**.

Алена Наздрова, якая пачне алімпійскае выступленне 4 жніўня, нягледзячы на свае 22 гады, ужо паспела двойчы выйграць чэмпіянат свету — у 2019 і 2018 гадах. Разам з Надзеяй Макарчанкай яны выйгралі чэмпіянат Еўропы сярод юніёраў і дарослых.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА.** Таццяна Халадовіч не прайшла ў фінал спаборніцтваў у кіданні кап'я. У стартавай спробе яна закінула снарад на 60 м 78 см і ў астатніх спробах не магла кінуць лепш. Як вынік — 13-е месца кваліфікацыі.

У сераду пачнуць выступленні ў кіданні кап'я Аляксей Каткавец і Павел Мялешка. Свой найлепшы вынік у кар'еры Аляксей Каткавец паказаў у 2020 годзе на чэмпіянаце краіны. Яго 86,05 м пераўзыходзіць «бронзавы» вынік Алімпіяды ў Рыа. Павел Мялешка ў маі гэтага года на Кубку Еўропы па кіданнях заваяваў «бронзу», закінуўшы снарад на 82,55 м. Гэты вынік зусім не мяжа спартсмена, у пачатку чэрвеня на турніры ў Чэхіі кап'ё Мялешкі паляцела на 85,06 м.

У сераду ў Токіа пачнуцца спаборніцтвы дзесяціборцаў, у якіх Беларусь прадставіць Віталь Жук, дарэчы, муж Ірыны Жук. Каб аціаніць, наколькі гэта моцны чалавек, варта мець на ўвазе, што ў праграму мужчынскага дзесяцібор'я ўваходзяць бег на 100 м, скачок у даўжыню, штурханне ядра, скачок у вышыню, бег на 400 м, 110 м з бар'ерамі, кіданне дыска, скачок з шастом, кіданне кап'я, бег на 1500 м.

**БАРАЦЬБА.** Барэц грэка-рымскага стылю Кірыл Маскевіч уступіў у 1/8 фіналу алімпійскага турніру прадстаўніку Егіпта Махамеду Метвалі. Спаборніцтвы па барацьбе працягваюцца. Да выхаду на дыван рыхтуецца Алі Шабанаў. Пачне сваё выступленне і «зорачка» беларускай жаночай барацьбы Ірына Курачкіна. Яе стрыжню, любові да сваёй справы і мэтанакіраванасці можна толькі пазайздросціць. З барацьбой яна пазнаёмілася ў 16 гадоў, што для любога віду спорту надта позна. А да гэтага займалася лёгкай атлетыкай — бегала на кароткія дыстанцыі. За 10 гадоў у барацьбе яна мужна пераносіла траўмы, перапынкі, страхі і збірала медалі розных турніраў. У яе скарбонцы поўны камплект медалёў чэмпіянатаў Еўропы і дзве «бронзы» чэмпіянатаў свету.

І хоць да заканчэння Алімпіяды ў Токіа застаецца ўсё менш часу, надзеі страчваць не варта. Алімпійскія гульні заўжды славіліся сваёй непрадказальнасцю.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МВФ выдзеліць 650 мільярдаў долараў на аднаўленне сусветнай эканомікі

Кіраўніцтва Міжнароднага валютнага фонду вырашыла выдзеліць спецыяльныя правы запазычання (SDR) у памеры рэкордных 650 млрд долараў на аднаўленне эканомік 190 членаў Фонду прапарцыянальна іх квотам. Асаблівая ўвага аддаецца краінам з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў. Ім дастанецца амаль палова маючых быць выдзеленымі сродкаў — 275 млрд долараў. Яны вылучаюцца краінам, якія развіваюцца, без традыцыйных для МВФ умоў. Гэта незваротныя грошы, вяртаць іх не трэба. «Прынята гістарычнае рашэнне, — адзначаецца ў заяве дырэктара МВФ Крысталіны Георгіевай. — Гэта найбуйнейшае вылучэнне SDR у гісторыі Фонду. Яно як укол глабальнай эканоміцы падчас беспрэцэдэнтнага крызісу». У МВФ лічаць сур'ёзнай перашкодай на шляху да аднаўлення пасля пандэміі абмежаваны доступ да вакцын у многіх краінах, якія развіваюцца.

### ЗША праводзяць найбуйнейшыя ваенна-марскія вучэнні з часоў халоднай вайны

Вучэнні Large Scale Exercise (LSE) — 2021 з удзелам 36 караблёў (у тым ліку авіяносцы і падлодкі) і Корпуса марской пяхоты праводзяцца ў 17 часавых паясах, паведаміла ТАСС. Манеўры будуць доўжыцца два тыдні. Як заўважыла газета Stars and Stripes, гэтыя вучэнні павінны паказаць здольнасць амерыканскіх узброеных сіл адначасова спраўляцца з выклікамі ў аддаленых адна ад адной частках Сусветнага акіяна, у тым ліку ў Чорным, Міжземным, Паўднёва-Кітайскім і Усходне-Кітайскім морах. «LSE-2021 праверыць навыкі нашых камандзіраў па правядзенні разнастайных ваенна-марскіх аперацый на тактычным і стратэгічным узроўнях. Да ўдзелу прыцягнутыя Корпус марской пяхоты, што прадэманструе магчымасці нашага флоту праводзіць сумесныя аперацыі як у адкрытым акіяне, так і ў прыбярэжных водах», — заявілі ў камандаванні Шостага флоту.

### У М'янме сфарміравалі часовы ўрад



Дзяржаўны адміністрацыйны савет М'янмы заявіў пра фарміраванне часовага ўрада краіны. Пра гэта паведаміла агенцтва «Сіньхуа». Паводле яго даных, галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі М'янмы старшы генерал Мін Аун Хлайн зойме пасаду прэм'ер-міністра краіны. Паводле звестак агенцтва, старшы генерал таксама выступіў з тэлевізійным зваротам, у якім заявіў, што ў краіне плануецца правесці новыя ўсеагульныя выбары ў другой палове 2023 года. Як вядома, ваеннае камандаванне М'янмы 1 лютага абвясціла аб увядзенні на год надзвычайнага становішча і зрушэнні грамадзянскага кіраўніцтва краіны. Прадстаўнікі войска растлумачылі гэта маштабнымі фальсіфікацыямі, якія, на думку сілавікоў, адбыліся на ўсеагульных парламенцкіх выбарах, якія прайшлі ў лістападзе 2020 года.

# Рэгістрацыйныя карткі для таксістаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама негатыўны ўклад у дадзены працэс уносяць асобныя дыспетчары таксі, якія фактычна прымушаюць перавозчыкаў не выконваць заканадаўства.

У праекце ўказа ўтрымліваюцца палажэнні, якія маюць на ўвазе распрацоўку механізма допуску да рынку аўтамабільных перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах, у тым ліку аўтамабілямі таксі, шляхам увядзення рэгістрацыйных картак транспартнага сродку, картак допуску кіроўцы аўтамашыны, дыспетчара аўтамабільных перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах і дыспетчара таксі (у электронным выглядзе).

Сяргей Дубіна таксама расказаў пра тое, што ва ўказе замацоўваецца наступная норма: дзейнасць без атрымання названых картак допуску з'яўляецца незаконнай і забараняецца.

**У выпадку невыканання новага заканадаўства кіроўцы не змогуць перавозіць пасажыраў мінімум на працягу месяца.**

Паводле слоў намесніка міністра, рэалізаваць «шэрыя» схемы будзе немагчыма, таму што ў нядобрасумленных перавозчыкаў будуць адсутнічаць канкурэнтныя перавагі.

У выпадку невыканання заканадаўства будуць прымацца абмежавальныя меры: прыпыненне дзеяння карты допуску кіроўцы будзе прадугледжана на тэрмін да аднаго месяца, рэгістрацыйнай карткі транспартнага сродку і карткі допуску дыспетчара — на тэрмін да трох месяцаў. У выпадку паўторных парушэнняў дзеянне названых картак будзе спынена. Наступнае атрыманне картак допуску пасля спынення іх дзеяння будзе магчымае толькі праз шэсць месяцаў.

Атрыманне названых картак будзе арганізавана праз транспартную інспекцыю і яе філіялы па ўсёй краіне. «Гэтаму будзе папярэднічаць падрыхтоўчы перыяд. Мы разумеем, што за адзін раз зарэгістраваць усіх будзе складана. Парадак рэгістрацыі і прыпынення дзеяння картак допуску будзе вызначаны ўрадам. На дадзены момант гэты дакумент распрацоўваецца», — дадаў спецыяліст.

Дакументам прадугледжваецца абавязковае заключэнне аўтамабільнымі перавозчыкамі — юрыдычнымі асобамі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі (акрамя ІП, якія ажыццяўляюць дзейнасць самастойна без прыцягнення іншых асоб) з кіроўцамі працоўных дагавораў.

«Для добрасумленных перавозчыкаў фактычна нічога не мяняецца. Будзе афармляцца ў электронным выглядзе адпаведны допуск. Гэта будзе разавае дзеянне. Пасля паспяховага атрымання карткі допуску трэба будзе толькі выконваць заканадаўства», — падкрэсліў Сяргей Дубіна.

## АБ АРЭНДЗЕ МАШЫНЫ З ЭКІПАЖАМ

«Уводзіцца норма аб тым, што арэнда транспартнага сродку з экіпажам будзе дазволена толькі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам. Для фізічных асоб дадзеная норма будзе недаступная, каб гэтай нормай не злоўжывалі асобныя суб'екты, калі фактычна арэнда транспартнага сродку з экіпажам падпадае пад дзеянне грамадзянска-прававых і арэндных адносін і не адносіцца да перавозкі пасажыраў. Выключыўшы гэтую магчымасць, мы будзем казаць аб тым, што любая перавозка пасажыраў па дагаворы будзе падпадаць пад дзеянне Правілаў перавозак пасажыраў і закона аб аўтамабільным транспарце», — сказаў намеснік міністра.

## АБАРОНА КІРОЎЦАЎ І ПАСАЖЫРАЎ

«Фактычна кіроўцы — гэта наёмныя асобы, якія працуюць у перавозчыка. І калі казаць аб прафесіі і аб перавозцы аўтамабілямі таксі, то гэта не разавая функцыя, якую мы прыраўноўваем да дагавора падраду. Дагавор падраду па Грамадзянскім кодэксе — гэта разавая паслуга, якая аказваецца па дамоўленасці, і па завяршэнні гэтай паслугі выплачваецца ўзнагароджанне. Тут жа пытанне ставіцца так, што працоўныя ўзаемаадносіны перавозчыка і кіроўцы будуць гарантаваць абарону ў тым ліку і правоў самога кіроўцы. Таму што кожны кіроўца мае права на аплачваемы водпуск, гэтак жа як і на «бальнічны». У дагаворы падраду нічога гэтага няма. Вадзіцелі на сённяшні дзень неабароненыя: калі ты не прыйшоў — табе не заплацілі. І ў гэтай частцы будуць ствараццца дадатковыя ўмовы для абароны як саміх кіроўцаў, так і пасажыраў», — лічыць Сяргей Дубіна.

## АБ КАНТРОЛІ ГРАШОВЫХ ПАТОКАЎ І РЭАЛЬНЫХ ТАРЫФАХ

Прадстаўнік міністэрства запэўніў, што няма неабходнасці кантраляваць перавозчыкаў непасрэдна на дарозе. На сёння дастаткова кантролю за базай даных. «Цяпер дастаткова інструментаў для таго, каб, маючы базу даных аб транспартных сродках, аб іх перамяшчэнні, аб руху грашовых патокаў праз адпаведныя справаздачы, якія будуць прадстаўляцца ў Міністэрства па падатках і зборах (і цяпер прадстаўляюцца), сказаць, ці ажыццяўлялася перавозка ў канкрэтны момант часу, ці выконваліся патрабаванні заканадаўства. Задача — сысці з дарогі і не кантраляваць перавозкі непасрэдна на вуліцы», — кажа намеснік міністра.

Ёсць меркаванне, што новаўвядзенні зменяць тарыфную палітыку па гэтых паслугах. Магчыма, але, хутчэй за ўсё, яе зробяць разумнай для ўсіх. «Тарыфы ж не канкалююцца дзяржавай, яны фарміруюцца самімі перавозчыкамі. Але пытанне ў тым, з чаго складаецца кошт аднаго кіламетра ў канкрэтнага суб'екта прадпрымальніцкай дзейнасці. Калі вы не плаціце падаткі, вы не плаціце ў фонды сацыяльнай абароны, у вас няма па дагаворы найму кіроўцаў, у вас у арэндзе транспартныя сродкі, ніякіх адлічэнняў вы не робіце — тады, натуральна, у вас тарыфы могуць быць настолькі малыя, што прадпрыемства, якое добрасумленна выконвае ўсе ўмовы, папросту не можа працаваць на гэтым рынку побач з вамі. Тут пытанне не ў тым, павялічацца тарыфы ці не павялічацца. Калі ўсе перавозчыкі будуць у роўных умовах, то і кіроўцам не трэба будзе працаваць па 12—16 гадзін, каб зарабіць тую зарплату, якую сёння мы маем у сярэднім па горадзе ці краіне. Але ў цэлым на тарыфы гэта ніякім чынам не ўплывае», — заявіў Сяргей Дубіна.

**Начальнік упраўлення транспарту, сувязі і інфармацыйных тэхналогій Міністэрства антымонапольнага рэгулявання і гандлю Аліна КАЗАЧОНАК** лічыць, што іх ведамства праводзіць палітыку развіцця канкурэнцыі, абмежавання манапалізму, кантролю за цэнаўтварэннем, захавання прынцыпаў абароны правоў спажыўцоў ва ўсіх сферах, у тым ліку ў сферы паслуг таксі і аказання паслуг перавозак.

«Мы разглядалі праект гэтага ўказа, ацэньваючы яго з пункту гледжання наяўнасці нормаў, якія нейкім чынам уводзяць абмежаванні, няроўныя ўмовы доступу для ўдзельнікаў рынку, з пункту гледжання ўплыву на змяненне цэн, на прынцыпы абароны правоў спажыўцоў. З улікам аналізу ўсіх наступстваў, на цяперашні момант глабальных пытанняў па дадзеным указе ў міністэрства не маецца», — заявіла Аліна Казачонак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

«Зялёны» транспарт

# «ЭЛЕКТРЫЧКІ» — ГЭТА ПРОСТА І ВЫГАДНА

**Днямі на тэрыторыі добра вядомай сталічнай «Пясочніцы» (пр-т Машэрава, 11) прайшла выстаўка электрамабіляў. Гэта было самае маштабнае мерапрыемства сезона, прысвечанае экалагічнаму транспарту ў Беларусі.**

Мэтай выстаўкі было не простае знаёмства беларусаў з аўтамабілямі на электрацязе. Арганізатары наглядна прадэманстравалі адэкватную, тэхнічна «прасунутую» і эканамічную альтэрнатыву транспарту з рухавіком унутранага згарання, якая, акрамя ўсяго іншага, не забруджвае экалогію нашай планеты.

Для гэтага на адной пляцоўцы выставілі каля трыццаці розных электрамабіляў. Кожны наведвальнік мог забрацца ў любы з іх, асабіста ацаніць камфорт і іншыя магчымасці, а таксама атрымаць інфармацыю аб той ці іншай мадэлі ў спецыялістаў.

Акрамя таго, арганізатары прадстаўлялі не проста экспазіцыю электратранспарту, але і вялікі цыкл пазнавальных лекцый пра тыя нюансы, з якімі сутыкаюцца ці могуць сутыкнуцца ўладальнікі электрамабіляў. Абмяркоўвалася амаль два дзясяткі актуальных тэм: ад рэйтынгу папулярнасці, асаблівасцяў эксплуатацыі да развіцця заранаей інфраструктуры.

— Усе гэтыя еўрапейскія электрамабілі накшталт Volkswagen ID.3, Mazda MX-30 або Peugeot 208, яны вельмі класныя, — расказвае **прадстаўнік Tesla-cars.by Павел МУРАШКА**. — ID.3 з запасам ходу, большым за 400 кіламетраў, — выдатны аўтамабіль для штодзённай язды, нават на далёкія адлегласці на ім можна ездзіць спакойна. Але на постсавецкай прасторы яны не такія папулярныя. У нас у пашане Tesla, таму ў асноўным мы імі і займаемся. Пакуль незразумела, ці падоўжаць абнуленне пошлін з 1 студзеня 2022 года. Але менавіта з-за магчымага вяртання пошлін цяпер асабліва вялікі попыт на электрамабілі. І ў асноўным на Tesla, прычым самых розных мадэляў і ў самым розным стане. Заказваюць і новыя з салона. Пошлін няма, таму гэта выгадна...

Сёння ў краіне налічваецца больш за 4000 электрамабіляў, увезеных з-за мяжы. За першае паўгоддзе 2021 года ў нашу краіну ўвезена 2112 электрамабіляў — гэта больш, чым за ўвесь мінулы год (1810 машын). Так што калі казаць аб продажы мадэляў, якія прадстаўлены ў нашай краіне афіцыяльна, то гэта хутчэй пакуль разавыя пакупкі. Зрэшты, як адзначылі ў Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, новыя мадэлі аўто на электрацязе ў дылераў у найбліжэйшы час наўрад ці з'явяцца. Прычына ўсяму — складаная мытная сертыфікацыя і высокая цана для пакупнікоў. Цэны на электрамабілі ў масавым сегменце еўрапейскага рынку па-ранейшаму высакаватыя для чаканняў нашых спажыўцоў. Кошт самых бюджэтных мадэляў стартуе ад 30 тысяч еўра. Калі клас аўто прэміяльны, то гэтую лічбу можна памнажаць на два ці нават на тры.

Зрэшты, Bloomberg NEF і Міжнароднае энергетычнае агенцтва ўжо да канца гэтага года прагназуюць прырост колькасці электракараў у Беларусі да пяці тысяч, у 2022 — да 25 тысяч, у 2023-м — да 54 тысяч, у 2024-м — да 82,8 тысячы, у 2025-м — да 112 тысяч.

Мы знаходзімся толькі ў пачатку шляху развіцця электратранспарту ў краіне. Але «электрычак» сапраўды становіцца ўсё больш, гэта ўжо даўно не экзотыка.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

## У ТЭМУ

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі:**

— НАН Беларусі асвоіла практычна ўсе кампетэнцыі па праектаванні ўласных электрамабіляў з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій: распрацоўку дызайн-праектаў экстэр'еру, інтэр'еру, праектаванне хадавой часткі і сілавога электрапрывода. У супрацоўніцтве з МАЗам і БелАЗам вырабляюцца доследныя ўзоры электратранспарту і яго асноўныя кампаненты (цягавы электрарухавік, сілавая і кіравальная электроніка, батарэя). Мы працуем над электрамабілямі, над мадэлямі шырокай запатрабаванасці, сярэдняга класа, якія будуць даступныя шырокаму колу насельніцтва, усім спажыўцам. Гэта пакуль не аўтамабілі суперкласа або экстракласа, хоць і такія задумкі ў нас ёсць, каб мы маглі па патрабаванні любога спажыўца, карыстальніка зрабіць любыя опцыі. Але цяпер мы ствараем надзейны аўтамабіль для шырокага карыстальніка. Як хутка зможам наладзіць масавую вытворчасць, залежыць ад таго, як хутка мы зможам стварыць эксперыментальную вытворчасць.

Запас ходу залежыць ад магутнасці, мэтавай устаноўкі. Запас для ровара можа быць 50 км, для аўтамабіля малога класа — 200–400 км. Мы працуем над тым, каб у сярэднім запас ходу быў 500 км.

Акрамя назапашвальніка, вялікае значэнне мае і рухавік — гэта таксама ўнікальная распрацоўка беларускіх навукоўцаў, досыць удалая і паспяховая. Мы цяпер працуем над цэлым радам нашых электрарухавікоў для аўтамабіляў рознага карыстання. Я не ведаю, чым яны будуць адрозніваца ад Tesla. Усе параметры, якія мы закладвалі, яны вытрымліваюць. Гэта надзейнасць, даўгавечнасць, эксплуатацыя ў розных экстрэмальных умовах, ва ўмовах моцнага холаду, высокай спёкі. Мы робім усё, каб у цэлым па кошце аўтамабілі былі даступныя нашым спажыўцам. Мы яшчэ разглядаем пытанне ў тым плане, каб гэты назапашвальнік, кандэнсатар быў здымны. Не трэба прыязджаць, уключаць і доўга чакаць (тры-чатыры гадзіны), пакуль ён будзе зараджацца. Ёсць хуткая запраўка — 15–20 хвілін. Назапашвальнік павінен быць здымны: прыехаў на станцыю, здаў свой, паставіў іншы і паехаў. Так павінна быць. Гэта магчыма. Думаю, так і будзе.

І галоўнае: гаворка ідзе пра прынцыпова іншы аўтамабіль, не пра Geely. Менавіта — беларускі аўтамабіль з поўнай беларускай «начынкай».

# МАКСІМАЛЬНА ПРАЎДЗІВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Марат Жылінскі акрэсліў ключавыя кірункі, па якіх адбываюцца фальсіфікацыі. «Сёння асноўныя намаганні фальсіфікатараў засяроджаныя на ўкараненні ў свядомасць сусветнай грамадскасці антыгістарычных ідэй падабенства знешняй палітыкі СССР і фашысцкай Германіі: нібыта гэтыя краіны ставілі за мэту захоп Еўропы, сусветнае панаванне, — падкрэсліў рэктар. — Фальсіфікатары скажаюць вобраз савецкіх воінаў і савецкіх узброеных сіл у асобе Чырвонай Арміі, паказваючы іх у выглядзе гвалтаўнікоў, марадзёраў, якія прынеслі ў Еўропу не вызваленне, а нібыта акупацыю і разбурэнне. Акрамя таго, апаненты значна перабольшваюць даныя аб стратах савецкіх войскаў у ходзе ваенных дзеянняў з мэтай абвінавачвання камандавання ўсіх узроўняў у бесчалавечнасці і бессэнсоўнасці ахвяр. У тым ліку яны дыскрэдытуюць дзейнасць праслаўленых палкаводцаў, тых, каго ў народзе называюць Маршаламі Перамогі, а таксама памяншаюць значэнне вызваленчай місіі СССР у Еўропе, прыніжаючы ролю Савецкага Саюза ў ратаванні чалавецтва ад заняволення нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі».

Як паведаміў эксперт, адзін з асноўных кірункаў фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адносна нашай краіны заключаецца ў адмаўленні ўсенароднага характару барацьбы з нацысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі, быццам бы ўсенародная барацьба прыдумана савецкай прапагандай ужо пасля вайны, а беларускія партызаны — толькі закінутая з-за лініі фронту малаколькасная група НКУС.

## МАСАВА ІШЛІ Ў ПАРТЫЗАНЫ

**Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Марына КРАСНОВА**

Жыхары Гродна сустракаюць вызваліцеляў. Ліпень 1944 года.

акцэнтавала ўвагу на тым, як вывучаецца гісторыя Вялікай Айчыннай вайны ў школе. «Калі параўноўваць з краінамі былога Савецкага Саюза, такой увагі да ваеннай тэмы, як у Беларусі, няма больш нідзе, — перакананая навуковец. — Першае ўяўленне аб вайне школьнікі атрымліваюць ужо ў чацвёртым класе. У дзявятым пачынаецца сістэмнае вывучэнне гісторыі. У дзясятым класе вучні зноў вяртаюцца да тэмы вайны: адбываецца акцэнт не на падзеях, якія мелі месца быць, а на разуменні таго, што і чаму адбылося, што нам трэба зрабіць, каб такія падзеі больш не паўтарыліся ні на нашай тэрыторыі, ні ўвогуле ў свеце. У 2004 годзе па даручэнні Прэзідэнта Беларусі ў школьную праграму быў уведзены факультатыў «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны», выдадзены вучэбны дапаможнік, які добра ведаюць у суседніх краінах».

У цяперашні час Нацыянальнай акадэміяй навук ажыццяўляецца сур'ёзны праект беларускіх і расійскіх гісторыкаў з мэтай стварыць агульныя дапаможнікі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны для настаўнікаў. У іх павінны быць прадстаўлены пазіцыі як беларускіх, так і расійскіх гісторыкаў. Гэта, на думку вучоных, патрэбна для таго, каб школьнікі не проста атрымлівалі чыёсьці меркаванне аб вайне, а самі на аснове фактаў, аналізуючы іх, рабілі свае высновы. Каб, ужо скончыўшы школу, яны маглі самастойна разабрацца ў тым, што адбываецца ў свеце.

На думку Марыны Красновай, Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, галоўную ролю ў якой адыграў Савецкі Саюз, з'яўляецца ключавым элементам нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. «Ніякія перыпетыі нашай гісторыі — ні распад Савецкага Саюза, ні гарачыя 1990-я, ні нападкі, якія датычыліся ролі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне ў пачатку 2000-х, — не памянялі адносіны беларусаў да гэтай падзеі. Нам важна захаваць гэта, як і памяць аб ёй», — лічыць эксперт.

Акрамя таго, кандыдат педагагічных навук закранула тэму здрадніцтва. «У любым народзе ёсць людзі, якія ідуць на гэта, — упэўнена яна. — Аднак у Беларусі здрадніцтва не было масавай з'явай. А вось тое, што людзі масава ішлі ў партызаны і падпольшчыкі, гэта варта прызнаць».

## ЖАХІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр ГОРНЫ** расказаў аб гісторыі вызвалення Гродзеншчыны. Увесь жах вайны горад над Нёманам спазнаў ужо 1 верасня 1939 года, калі нямецкая авіяцыя бамбіла Польшчу, у складзе якой тады знаходзілася Гродзенская вобласць. У гады Вялікай Айчыннай вайны 23 чэрвеня 1941 года Гродна быў захоплены нямецка-фашысцкімі войскамі, да канца ліпеня была акупавана ўся тэрыторыя сучаснай Гродзеншчыны. Тэрыторыя цяперашніх Гродзенскага і Ваўкавыскага раёнаў (тады гэта была Беластоцкая вобласць) увайшла ў склад Трэцяга рэйха. У гады вайны гэта была тэрыторыя Германіі, Усходняй Прусіі. Малавядомы факт: на дадзенай тэрыторыі дзейнічалі органы гестапа. У горадзе для яўрэйскага насельніцтва былі створаны два гета, актыўна праследавалася польская інтэлігенцыя.

— Калі казаць пра асаблівасць акупацыі на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, гітлераўцы праводзілі палітыку сутыкнення лбамі прадстаўнікоў шматлікіх нацыянальнасцяў, якія тут пражывалі, — адзначае кандыдат гістарычных навук. — У першую чаргу яны выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах беларуска-польскі канфлікт, які быў найбольш актуальны на тэрыторыі сучасных Лідскага і Шчучынскага раёнаў. Дзеянні польскага падполля, Арміі Краёвай, якая актыўна дзейнічала супраць беларусаў, — яшчэ адна рыса акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Не так шырока, як ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі, але быў прадстаўлены на Гродзеншчыне і савецкі партызанскі рух. З ворагам змагалася каля 17 тысяч партызанаў, 26 партызанскіх брыгад, падпольшчыкі.

— Тэрыторыя Гродна і ўсёй вобласці была вызвалена ў 1944 годзе ў ходзе другога этапу аперацыі «Багратыён», падчас Беластоцкай і Віленскай аперацый, — расказвае Аляксандр Горны. — 16 ліпеня была вызвалена правабярэжная частка горада. За левабярэжную ж змагаліся цэлы тыдзень. Тое, што горад вызваляўся працягла і трагічна, на жаль, ніяк не прадстаўлена ў мемарыяльнай прасторы сучаснага горада. Каля 40 працэнтаў горада было разбурана, не выстаялі вядомыя помнікі архітэктуры, якія пасля вайны не былі адноўлены. Пасля вайны горад страціў свой сярэднявечны арэал.

## НЕВЯДОМЫЯ ФАКТЫ

Як высветлілася, тэма Вялікай Айчыннай вайны сёння надзвычай папулярная сярод студэнтаў-гісторыкаў. «Адна з галоўных праблем тых, хто займаецца даследаваннем увогуле ваеннай гісторыі Беларусі XX стагоддзя, — гэта абмежаваны доступ да архіваў і дакументаў, — растлумачыў **дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй МАКСІМЧЫК.** — У асноўным даводзіцца працаваць з раней выдадзенымі зборнікамі дакументаў або з тым, што цяпер актыўна выкладваецца ў глабальную сетку, што дазваляе адкрываць у тым ліку новыя, раней невядомыя факты ўдзелу і подзвігу асобных вайскоўцаў і партызанаў на тэрыторыі Беларусі».

Гісторык прызнае, што ў даследаванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў нас ёсць пэўныя праблемы. «Трэба пагадзіцца і з тым, што першай ахвярай на вайне становіцца праўда, — мяркуе Андрэй Максімчык. — Яна, магчыма, нам яшчэ не да канца вядомая. Мы знаходзімся ў цісках савецкай парадыгмы, таго падыходу да інтэрпрэтацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны. І калі з'яўляюцца працы, якія вельмі рэзка выбіваюцца з гэтага кантэксту, на іх чамусьці адразу накідваюцца і гаворадь аб тым, што гэта чарговы прадукт фальсіфікацыі. Насамрэч жа, калі паглядзець на той матэрыял, які быў выкарыстаны, даследаванні падрыхтаваныя на такой жа архіўнай базе, з якой працавалі нашы папярэднікі. У савецкі перыяд многае адфільтроўвалася, асабліва гэта датычылася падпольнага і партызанскага руху».

— Адыходзяць сведкі вайны, і мы на іншым эмацыянальным узроўні ўспрымаем тыя падзеі, — канстатуе кандыдат гістарычных навук. — Праз некалькі гадоў Вялікая Айчынная вайна для нас будзе нечым далёкім. Гэта заканамерна і аб'ектыўна. Таму нам, у першую чаргу гісторыкам, патрэбна максімальна сканцэнтравацца на выяўленні новых фактаў, публікацый дакументаў, рабоце, звязанай з гістарычнай памяццю. Нам трэба звярнуць увагу на помнікі, якія маюць патрэбу ў рэстаўрацыі, падняць тыя падзеі, якія потым могуць стаць асновай для мемарыялізацыі і стварэння новых аб'ектаў, якія патрэбныя нашай краіне».

Будзьце пільныя!

# СУПРАЦЬ ВОГНЕННАЙ СТЫХІІ

## Колькасць лясных пажараў скарацілася

**Беларускія ратавальнікі змагаюцца з пажарамі ў Петрыкаўскім раёне, што на Гомельшчыне, — там гараць тарфянікі. Плошча ўзгарання зменшылася і ўжо складае 40 гектараў, аднак работа па ліквідацыі ачагоў працягваецца.**

У тушэнні пажару задзейнічаны 22 адзінкі тэхнікі і каля ста чалавек, сярод якіх — супрацоўнікі МНС, прадстаўнікі мясцовага прадпрыемства меліярацыйных сістэм і сельскагаспадарчых арганізацый. Ускладняюць тушэнне глыбіня залягання торфу, недастатковы ўзровень вады ў сістэме меліярацыйных каналаў, а таксама гарачыня апошніх тыдняў. Днямі крыху пахаладала, узмацніўся вецер — узнікла небяспечнасць узгарання сухой травы. Пажарнікі ўжо ліквідуюць ачагі, якія ўзніклі ў выніку неасцярожнага абыходжання з агнём.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, пажаранебяспечная абстаноўка ў лясным фондзе нашай краіны стабілізавалася. Толькі ў асобных раёнах Беларусі захоўваецца чацвёрты клас пажарнай небяспекі. У большасці ж рэгіёнаў ужо знятыя забароны і абмежаванні на наведванне лясоў. Па стане на ўчарашнюю раніцу, меры абмежавальнага характару дзейнічаюць усяго ў 11 раёнах краіны.

— З пачатку года ў лясным фондзе Мінлясгаса адбылося 316 узгаранняў, — адзначаюць у прэс-службе. — Агульная плошча ачагоў склала звыш 370 гектараў. Найбольшая колькасць узгаранняў фіксуецца ў паўднёвай частцы краіны: у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. З пачатку года тут адбылося 90 і 87 лясных пажараў адпаведна. За аналагічны перыяд на Віцебшчыне было зафіксавана 19 выпадкаў узгарання, на Гродзеншчыне — 32, Міншчыне — 43, Магілёўшчыне — 45 узгаранняў.

Асноўнай прычынай узнікнення пажараў па-ранейшаму з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём, выпальванне сухой травы, прыродныя з'явы. Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян з разуменнем аднесціся да існуючых забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў, а таксама не парушаць правілы пажарнай бяспекі.

**Вераніка КАНЮТА.**

Супрацоўнікі МНС падчас ліквідацыі пажару ў Петрыкаўскім раёне.

## Извещение о проведении 19 августа 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
— Пацыентам важна знаходзіцца пад назіраннем медыкаў, якія своечасова заўважаць прагрэсіраванне захворвання, яго пераход у пухлінную стадыю. Адным з небяспечных ускладненняў можа стаць гепатацэлюлярная карцэнома. Таму нашы пацыенты штогод праходзяць УГД печані, абследаванні на наяўнасць ачаговых утварэнняў. Ёсць і біяхімічныя маркёры прагрэсіравання захворвання. Тут многае залежыць ад самога хворага — яго прыхільнасці да лячэння, выканання рэкамендацый і прыёму тэрапіі. Правільна падабраная тэрапія дазваляе знізіць рызыкі прагрэсіравання хваробы, а гепатыт С можна цалкам вылечыць, — рэзюмуе Святаслаў Вельгін.

Небяспечны сезон

# УПАЎ, АПРЫТОМНЕЎ — ГІПС...

## Летам медыкі фіксуюць пік дзіцячага траўматызму

**Гэта сезон дзіцячай свабоды і адначасова пік траўматызму. Актыўныя школьнікі праводзяць шмат часу на вуліцы, катаюцца на роварах і самакатах, плаваюць і ныраюць у вадаёмах, залазяць на дрэвы і гаражы. У гэты час бацькам трэба быць асабліва ўважлівымі — не стамляцца тлумачыць правілы бяспекі і асабіста дэманстраваць прыклад адказных паводзін.**

Штогод траўматолагі канстатуюць каля 150 тысяч зваротаў дзяцей і падлеткаў з рознага кшталту траўмамі. Лета — самы небяспечны ў гэтых адносінах перыяд. Паводле інфармацыі **галоўнага пазаштатнага дзіцячага артапеда-траўматолага Міністэрства аховы здароўя, вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі наступстваў пашкоджанняў і захворванняў пазваночніка і спіннога мозгу РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Дзмітрыя ЦЕСАКОВА,** каля 20 працэнтаў ад усіх зваротаў у РНПЦ — траўмы і пашкоджанні ў дзяцей і падлеткаў. Штогод каля 60—80 дзяцей становяцца інвалідамі.

Самымі небяспечнымі траўмамі, якія вядуць да інваліднасці, з'яўляюцца пашкоджанні пазваночніка. У летні перыяд яны здараюцца, як правіла, у нырцоў.

— У сярэднім штодзень у краіне адно дзіця ці падлетак атрымлівае траўму падчас нырання, ударыўшыся галавой аб дно, — кажа Дзмітрый Цесакоў. — Тры тыдні таму прааперыравалі 16-гадовага хлопца, ён музыкант-піяніст. Вырашыў нырнуць, атрымаў найскладанейшы пералом шыйнага аддзела пазваночніка. Дзякуй богу, што яго своечасова паспелі даставіць у наш РНПЦ і прааперыраваць. На шчасце, нам удалося ліквідаваць неўралагічную сімптаматыку. Цяпер яго чакае доўгі перыяд аднаўлення.

У РНПЦ траўматалогіі і артапедыі аказваецца экстранная аперацыйная дапамога, і летам сюды прывозяць усіх пацыентаў з траўмай пазваночніка. У апошнія тыдні прааперавана каля 10 такіх дзяцей і падлеткаў.

— Гэта або купальшчыкі-ныральшчыкі, або тыя, хто выпаў з акна ці ўпаў з дрэва, — кажа Дзмітрый Цесакоў.

Траўматолаг адзначае, што там, дзе адпачынак арганізаваны — у лагерах, дзіцячых санаторыях, паказчык траўматызму нізкі. У такіх месцах наладжаны графік і ў дзяцей няма свабоднага часу. Зусім іншая сітуацыя, калі малое пакінута на самога сябе. Траўмы здараюцца, калі дзеці застаюцца без належнага нагляду, купаюцца ў непадыходзячых для гэтага вадаёмах.

Самы небяспечны ўзрост — 10-13 гадоў, расказвае **ўрач-траўматолаг-артапед траўматолага-артапедычнага аддзялення для дзяцей РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Юрый ЛІХАЧЭЎСКІ.** На другім месцы па частаце траўміравання — дзеці 5-9 гадоў, на трэцім — 15-17-гадовыя. Найчасцей здараюцца бытавыя траўмы, на другім месцы — вулічныя, пасля ідуць спартыўныя і транспартныя.

Самыя частыя ў дзяцей — траўмы канечнасцяў, яны складаюць 74 працэнты, на другім месцы — траўмы галавы і шыі. Летась каля дзвюх тысяч дзяцей атрымала траўмы падчас катання на роварах, 820 — на скейтбордзе і роліках, 499 — падчас скачкоў на батуце. Нярэдкія траўміраванні пры катанні на электраскутарах і манаколах.

За мінулы год амаль 146 тысяч дзяцей звярнулася да медыкаў з траўмамі. У лідарах — юныя мінчане, на другім месцы — жыхары Брэстчыны, найменш было такіх здарэнняў у Гродзенскай вобласці.

Зона бачнасці

# ПЛАНЕТА «ПРЫЖМУРАНЫХ» ЛЮДЗЕЙ

## Як запаволіць развіццё блізарукасці

**Па статыстыцы, кожны трэці жыхар планеты мае блізарукасць. Часта яна фарміруецца ў школьныя гады і пераважна ў падлеткаў. Відавочна, што пагаршэнне зроку шматразова зніжае якасць нашага жыцця, а ўжо калі гаворка ідзе пра дзяцей, то гэта пытанне іх будучыні, бо нізкі зрок перашкаджае нават выбару прафесіі. Ці можна пазбегнуць блізарукасці? І што рабіць, калі яна ўсё ж наступіла? Якія міфы часта прыводзяць да пагаршэння хваробы? Пра гэта і іншае расказала галоўны пазаштатны афтальмолаг Мінскага раёна Таццяна МІРКЕВІЧ.**

***— Таццяна Дзмітрыеўна, давайце разбяромся, што ж такое блізарукасць і чаму яна ўзнікае?***

— Блізарукасць — гэта праблема сусветнага маштабу, і яе распаўсюджванне звязана ў першую чаргу з тымі тэхналогіямі, якія ўвайшлі ў наша жыццё. Дзеці сталі вельмі шмат часу праводзіць за камп'ютарамі і планшэтамі.

Фарміраванне выявы адбываецца на сятчатцы вока, менавіта гэты механізм дазваляе бачыць выразна. А ў блізарукіх людзей карцінка фарміруецца перад сятчаткай, а не на ёй, таму яна атрымліваецца размытая. Адбываецца гэта альбо з-за павелічэння даўжыні вока (восевая блізарукасць), альбо з прычыны вялікай пераламляльнай сілы рагавіцы (рэфракцыйная блізарукасць). На практыцы, як правіла, сустракаецца спалучэнне абодвух гэтых механізмаў. Праяўляецца блізарукасць расплывістай карцінкай, зніжэннем зроку ўдалячынь, галаўным болем, павышанай зрокавай стамляльнасцю.

Упершыню блізарукасць выяўляецца ў 7-11 гадоў, хоць дыягнаставаць захворванне можна ўжо і ў дзяцінстве. У падлеткавым узросце блізарукасць, якую выявілі ў дзяцінстве, прагрэсіруе. Гэта звязана з гарманальнай перабудовай у арганізме. Да 20-ці гадоў, як правіла, зрок становіцца стабільным, бо гарманальны фон нармалізуецца. Наяўнасць захворвання ў аднаго ці абодвух бацькоў з'яўляецца фактарам рызыкі ў адносінах да прагрэсіравання блізарукасці. Звычайна захворванне развіваецца па наступнай схеме: пры рабоце зблізку (чытанне, асабліва ў планшэце, тэлефоне) галава нахіляецца наперад (пагаршаюць гэты момант няправільная пасадка і пастава), павышаецца нагрузка на пазваночнік, адбываюцца зрушэнне шыйных пазванкоў і напружанне мышцаў шыі, пагаршаецца кровазабеспячэнне мозга і вока, здольнасць вочных мышцаў факусіравацца, і становіцца горш відаць удалячынь. З часам вось вочнага яблыка ў пярэднезаднім кірунку падаўжаецца (восевая блізарукасць), гэта значыць вока расцягваецца. Калі дзіця доўга працуе зблізку, то з цягам часу расцяжэнне вока з часовага (функцыянальная слабасць мышцаў, якія факусіруюць) становіцца пастаянным (анатамічная змена вока).

***— Некаторыя бацькі лічаць, што нашэнне акуляраў спрыяе зніжэнню зроку, і свядома адмаўляюцца ад іх набыцця свайму дзіцяці...***

— Гэта, мякка кажучы, у корані няправільна. Наадварот, адсутнасць правільнай і максімальна поўнай карэкцыі прыводзіць да прагрэсіравання захворвання. Варта разумець, што з дапамогай акуляраў або кантактных лінз мы не толькі лепш бачым, але і развіццё хваробы спыняецца.

***— Цяпер з'явіліся лінзы, якія надзяваюцца на ноч і такім чынам паляшаюць зрок. Ці сапраўды гэта працуе?***

— Навінка ў афтальмалогіі — так званыя артакераталагічныя лінзы, у народзе проста начныя. Яны выдатна падыдуць для актыўных і рухавых дзяцей. Лінзы надзяваюцца на вока на ноч, а раніцай здымаюцца, што дазваляе дзіцяці займацца актыўнымі відамі спорту і пры гэтым усё выдатна бачыць без выкарыстання акуляраў.

***— А ці можна дзецям з дрэнным зрокам займацца спортам? І што рабіць, каб блізарукасць не наступіла?***

— Кожныя 45 хвілін работы неабходна рабіць перапынак на пяць хвілін, пры блізарукасці высокай ступені час работы знізіць да 25 хвілін, а час адпачынку павялічыць да 10 хвілін. Пры пачатковай блізарукасці эфектыўнымі з'яўляюцца практыкаванні для цыліярнай цягліцы — рухі вачыма па гарызанталі і вертыкалі, кругавыя вярчальныя злева-направа, сціскання і расціскання павекаў, частыя марганні, перавод погляду з блізкай кропкі на далёкую. Пры няўскладненай блізарукасці карысна займацца фізкультурай і спортам. А вось пры ўскладненай супрацьпаказаныя ўсе віды спорту, звязаныя з вялікім фізічным напружаннем, ударамі і страсеннямі.

Папярэджанню прагрэсіравання і лячэнню ўскладненняў спрыяюць некаторыя медыкаменты. Напрыклад, прэпараты кальцыю служаць для ўмацавання вонкавай абалонкі вока (кальцэмін, глюканат кальцыю, кальцый D3 нікамед і іншыя). Аскарбінавая кіслата спрыяе паляпшэнню абмену ў тканках вока і ўзмацненню сінтэзу калагену. Нікацінавая кіслата нармалізуе і паскарае цыркуляцыю крыві ў воку. Руцін дапамагае ўмацаванню сценак сасудаў. А правільнае, насычанае вітамінамі харчаванне прынясе карысць усяму арганізму і вачам у прыватнасці. Але трэба сказаць, што ў выбары прэпаратаў і вызначэнні частаты паўторных курсаў лепш даверыцца ўрачу-афтальмолагу, які падбярэ іх на аснове індывідуальных асаблівасцяў дзіцяці.

# ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,**
опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460)
**с дополнением от** 01.07.2021 **№** 123 (29492)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Местонахождение: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460) с дополнением от 01.07.2021 № 123 (29492), следующие изменения и дополнения:

**Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:**

начало строительства – апрель 2019 года;

окончание строительства – май 2022 года.

**Результаты государственной экспертизы проектной документации:**

Положительные заключения государственной экспертизы № 1021-60/18 от 08.11.2018, № 1388-60/18 от 21.01.2019, № 1021-60/18-Д1 от 20.02.2020 г., № 422-60/21 от 15.07.2021, выданные Дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по г. Минску».

**Характеристика объекта строительства:**

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома по ул. Гастелло (далее – «жилой дом») по индивидуальному проекту.

Жилой дом 10-этажный с двумя подземными уровнями, цокольным этажом, «теплым» техническим чердаком и встроенными помещениями общественного назначения имеет следующие основные показатели: количество секций – 4; количество квартир – 186 (в том числе однокомнатных – 106, двухкомнатных – 19, трехкомнатных – 54, четырехкомнатных – 7); гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами; 6 административно-торговых помещений с отдельными входами; гараж-стоянка на 170 машино-мест.

Жилой дом расположен в центральном районе г. Минска. Транспортное обслуживание осуществляется с улиц Гастелло и Тарханова. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный железобетонный каркас с заполнением мелкоштучными кладочными материалами наружных стен. Здание имеет в каждой из секций по одному лифту.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы и конвекторы. Вентиляция жилых помещений – естественная с притоком через окна (вентиляционные клапана). Вентиляция гаража-стоянки, администрации гостиницы с фитнес-залами – приточно-вытяжная с механическим побуждением; номеров гостиницы, административно-торговых помещений – механические вытяжные системы с естественным притоком через окна (вентиляционные клапана). Здание оборудовано системой хозяйственно-питьевого водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из гараж-стоянки, система подпора воздуха в шахты лифтов и тамбур-шлюзы в гараж-стоянке, автоматическое пожаротушение в гараж-стоянке. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной установки электрощитов. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

**Строительная готовность жилых помещений:**

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна (вентиляционные клапана), вытяжка через вентблоки санузлов и кухонь. С установкой бытовых вентиляторов в кухнях и санузлах верхних этажей;
- электроснабжение – поквартирная разводка электроосвещения с установкой выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты, розеток (за исключением 1 розетки под модем). Без внутриквартирной разводки электроснабжения;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета воды, полотенцесушитель; подключение унитаза;
- канализация – стояк, установка унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на балконы – из ПВХ профилей со стеклопакетом, витражи – из алюминиевого профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная – металлическая;
- автономный пожарный извещатель.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами, 6 административно-торговых помещений с отдельными входами, машино-места в двух подземных и этажах гараж-стоянки, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** 02.05.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

# ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,**
опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364)
**с дополнением от** 01.07.2021 **№** 123 (29492)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства машино-мест в гараж-стоянке, расположенной в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Местонахождение: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460) с дополнением от 01.07.2021 № 123 (29492), следующие изменения и дополнения:

**Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:**

начало строительства – апрель 2019 года;

окончание строительства – май 2022 года.

**Результаты государственной экспертизы проектной документации:**

Положительные заключения государственной экспертизы № 1021-60/18 от 08.11.2018, № 1388-60/18 от 21.01.2019, № 1021-60/18-Д1 от 20.02.2020 г., № 422-60/21 от 15.07.2021, выданные Дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по г. Минску».

**Характеристика объекта строительства:**

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома по ул. Гастелло (далее – «жилой дом») по индивидуальному проекту.

Жилой дом 10-этажный с двумя подземными уровнями, цокольным этажом, «теплым» техническим чердаком и встроенными помещениями общественного назначения имеет следующие основные показатели: количество секций – 4; количество квартир – 186, двухкомнатных – 19, трехкомнатных – 54, четырехкомнатных – 7); гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами; 6 административно-торговых помещений с отдельными входами; гараж-стоянка на 170 машино-мест.

Жилой дом расположен в центральном районе г. Минска. Транспортное обслуживание осуществляется с улиц Гастелло и Тарханова. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный железобетонный каркас с заполнением мелкоштучными кладочными материалами наружных стен. Здание имеет в каждой из секций по одному лифту.

Подземная гараж-стоянка – двухуровневая (два подземных уровня), неотапливаемая. Вместимость гараж-стоянки – 170 машино-мест. Въезды/выезды в гараж-стоянку, движение автотранспорта между уровнями на отметках -10,250 и -6,850 предусмотрены по наклонным рампам. Вертикальная технологическая связь между уровнями гаража-стоянки и жилыми этажами предусмотрена по двухмаршевым лестницам в объемах лестничных клеток и пассажирскими лифтами (в каждой секции).

Ворота – подъемно-секционные.

Приточные и вытяжные системы вентиляции с механическим побуждением движения воздуха – автономные для каждого уровня подземного гаража-стоянки: без нагрева приточного воздуха, с вентиляционным оборудованием приточных и вытяжных систем в венткамерах, с дополнительным регулированием расхода приточного воздуха по датчику угарного газа.

Планировка подземной гараж-стоянки предусматривает размещение в своем объеме всех необходимых для ее эксплуатации технических помещений, в том числе зона для хранения велосипедов и станция зарядки для электромобилей.

**Строительная готовность гараж-стоянки:**

- полы – с покрытием из бетона.
- вентиляция – приточно-вытяжная механическая вентиляция;
- электроснабжение – электроосвещение, станция для зарядки электромобилей;
- двери - металлические;
- ворота – подъемно-секционные;
- система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре;
- система контроля и управления доступом на входных дверях;
- система видеонаблюдения;
- система автоматического пожаротушения;
- система автоматического дымоудаления и подпора воздуха при пожаре.

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (машино-мест), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 42 (сорок два) машино-места общей площадью по проекту от 11,50 до 14,50 кв. метра, расположенных на 1 подземном уровне гараж-стоянки. Стоимость 1 (одного) машино-места составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 10 000 долларов США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 10 500 долларам США;
- 42 (сорок два) машино-места общей площадью по проекту от 11,50 до 14,50 кв. метра, расположенных на 2 подземном уровне гараж-стоянки. Стоимость 1 (одного) машино-места составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 9 000 долларов США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 9 500 долларам США.

На предприятии действует система регулирования цены машино-места, зависящая от общей площади, уровня расположения, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса и графика внесения платежей. Цена объекта долевого строительства (цена договора), установленная в договоре в привязке к иностранной валюте, является неизменной до окончания строительства, за исключением случаев, изменения цены объекта долевого строительства по соглашению сторон.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами, 6 административно-торговых помещений с отдельными входами, машино-места в двух подземных этажах гараж-стоянки, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** 02.05.2022 года.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: info@torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «ГлобоКарт», г. Минск, пл. Свободы, д. 17, пом. 734б** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| 781 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6690 | 1506,26 бел. руб. |
| 782 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6691 | 1506,26 бел. руб. |
| 783 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6689 | 1506,26 бел. руб. |
| 784 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6684 | 1506,26 бел. руб. |
| 785 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6688 | 1506,26 бел. руб. |
| 786 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6668 | 1506,26 бел. руб. |
| 787 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6661 | 1506,26 бел. руб. |
| 788 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6662 | 1506,26 бел. руб. |
| 789 | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6665 | 1506,26 бел. руб. |
| 790 | Велосипед водный «Чиж-М» БМ 6638, заводской № 401 | 1004,17 бел. руб. |
| 791 | Велосипед водный «Стриж», б/н, дата постройки 19.07.17, заводской № 4 | 1004,17 бел. руб. |

**расположенные по адресу:**
Минская область, г. Узда, пер. К. Маркса, 12

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с (IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен единственным участником ООО «ГлобоКарт»

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 06.09.2021 в 09.00.**
**Дата и время окончания торгов: 06.09.2021 в 16.00.**
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
**02.09.2021 до 17.00** на ЭТП ООО **«Расантехторг»**
по электронному адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by**

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет аукциона:

**МАГАЗИН ВСТРОЕННЫЙ**

**(административно-торговое помещение магазин встроенный),**
общ. пл. 368 кв. м, инв. № 240/D-36384,
адрес: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75 – 137.

Начальная цена с НДС 20 %: **103 018,57 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение **3 дней** после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 13.07.2021

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**18.08.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.08.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# ХТО ПАДКАЖА?..

## ІМЯ

Ягорка быў не адзіны сын у дружнай сям'і. Назвалі яго так у памяць пра дзеда, Ягора Канстанцінавіча, які не вярнуўся з вайны. Быццам, казалі, загінуў пад Ленінградам. У першым баі. Яго жонка, а Ягоркава, значыць, бабуля, дужа палюбіла ўнука і, здаралася, не без гордасці паказвала суседкам сваю радасць: «Як выліты Ягор! Гляньце толькі — нават ходзіць так, шырока размахваючы рукамі! Ды і позірк дзедаў! Не, што ні кажыце, імя таксама яму падыходзіць, як нікому з унукаў!» Таму за адно толькі імя салдацкая ўдава гатовая была насіць унука на руках. Але — да пэўнага часу. Неяк ён прыйшоў са школы засмучаны, кінуў ранец на лаву, хмыкнуў:

— Не падабаецца мне маё імя! Не хачу яго больш! Усе — Колі, Іваны, Мішы ды Сашы, а я — Ягор.

Маці пастаралася супакоіць сына:

— Чаму ж, у цябе надта прыгожае імя. Яго мой тата насіў. А цяпер вось ты. І я, можа, яшчэ больш цябе люблю, чым тваіх брацікаў — Воўку і Міколку. За імя. Імя, сынок, для чалавека многае значыць... Даражы сваім імем... Ганарыся, што яно ад дзеда табе дасталося... Ад дзеда-франтавіка...

— Не, не хачу такое імя! Яно нямоднае! — настойваў Ягорка. — І дражняцца ўсе, асабліва хлапчукі: Ягор — бугор, Ягорка — будзе горка, Ягорка — аборка... Ягорка — абжорка... Не хачу гэтае імя!..

У той дзень на тым размова і скончылася.

Ягорка падрос, стаў старшакласнікам, а неўзабаве і скончыў адзінаццаць класаў. Ад таго дня, калі была Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, мінула роўна дваццаць гадоў. Перад тым як атрымаць атэстат аб сярэдняй адукацыі, папрасіў у настаўніцкай, каб у ім замянілі «Ягор» на «Ігар». Гэтае імя, маўляў, мае тое ж значэнне. Кіраўніцтва школы не пагадзілася з Ягорам, узніклі спрэчкі і сярод настаўнікаў. Адны не бачылі ў гэтым нічога заганнага, іншыя раілі выпускніку з'ездзіць у раён, у пашпартны стол. Як толькі там дазволяць — калі ласка, будзь сабе і Ігарам!..

Там дазволілі. Так Ягор стаў Ігарам.

А бабуля, якую пасля вайны аднавяскоўцы пачалі клікаць Ягорыхай і якая пазней нават забылася, якое ў яе сапраўднае імя, калі даведалася пра такі ўчынак унука, вельмі пакрыўдзілася на яго і нават пэўны час, кажуць, не размаўляла. «Вочы б мае яго не бачылі! Так памяць дзеда зняважыць!»

Даўно не стала Ягорыхі, пайшлі ў іншы свет і бацькі Ігара. Прабачце, не Ігара, — Ягора: колькі гадоў таму ён зноў вярнуў сабе ранейшае імя. Пасталеў, паразумнеў. Ды і само імя — Ягор — неяк стала вельмі папулярнае ў народзе. Як Арцём, Мацвей, Дзяніс, Даніла...

Шкада, што не дажыла да таго часу, калі паразумнеў яе ўнук, салдацкая ўдава Ягорыха...

## ЧАЛАВЕК — ЧАЛАВЕКУ

Юльяна Пятрэнка, маладая пісьменніца-гамяльчанка, расказала мне надоечы наступную гісторыю.

— Ёсць у мяне знаёмая. Гадоў пятнаццаць таму яна прыехала з вёскі ў наш абласны цэнтр. Вырвалася з паўразваленай хаты і шматдзетнай сям'і, дзе бацькі пілі па-чорнаму. Ёй было вельмі цяжка. Вучылася, працавала, здымала кватэру. Яна ніколі не прасіла дапамогі і не прызнавалася, што часам няма чаго есці, але я чыста па-чалавечы дапамагала ёй, бо заўважала, што сродкаў у дзяўчыны не хапае. Давала ці пазычала грошай, сілком упіхвала ў рукі прадукты харчавання. Здаралася, купляю сабе калготкі ці бальзам для вуснаў — і заадно бяру для яе.

— Мне няёмка неяк... — казала яна, прымаючы з рук пакет.

— Ды ну, мне гэта нічога не каштуе, — адказвала я, — мне прыемна, калі табе прыемна.

Мінулі гады. Яна выйшла замуж за добрага хлопца. Яны заўсёды былі разам і ва ўсім падтрымлівалі адно аднаго. Пакрысе раскруцілі свой бізнес.

Цяпер яна заязджае на Х-5 і прывозіць пакеты з падарункамі мне і дзецям.

— Мне няёмка неяк... — кажу я, выходзячы за веснічкі.

— Ды ну, мне гэта нічога не каштуе, — усміхаецца яна. — Мне прыемна, калі табе прыемна...

Так і павінна быць. Малайцы, жанчыны. Толькі гэта і магу сказаць.

## АДКРЫЦЦЁ

Сяргей Міхайлавіч — дужа заядлы аўтамабіліст. Калі ён пачынае пералічваць, уладальнікам якіх аўтамашын быў, і будзе загінаць пальцы, то на адной руцэ іх, прынамсі, не хопіць: «Запарожац», «Масквіч», «Жыгулі», «Аўдзі»... Ну і гэтак далей. Сёння ён кіруе японскай «Таётай». «Тэхніка што трэба! — пры выпадку хваліўся набытым аўтамабілем і паказваў вялікі палец. — Во тэхніка! Шык-бляск! Нашай да яе далёка!» А якой нашай — не згадваў. Аднак пазней ён на свае вочы ўбачыў, што і яна, хвалёная японская тэхніка, іншым разам можа выходзіць са строю. Забарахліла «Таёта». Нічога не заставалася, як паказацца ў сервіс-цэнтры. Хлопцы прыдзірліва аглядзелі аўтамашыну, прапанавалі яе пакінуць і прыйсці пазней. Ну а калі ў яго ёсць час, то можа і тут пачакаць. Прыкінулі: гадзіны на дзве работы. Не болей. Сяргей Міхайлавіч пакінуў майстрам нумар мабільнага тэлефона і паабяцаў вярнуцца па легкавік, як толькі яны яму патэлефануюць. Чаго, маўляў, сядзець мне тут? Вырашыў лепш прайсціся па крамах, што месціліся паблізу ад сервіс-цэнтра. Можа, што нагледзіць, набыць вартае. Калі яшчэ надарыцца такая вось вольная хвіліна!

Так і зрабіў. А ўвечары, вярнуўшыся дадому, глядзеў на жонку і здзіўлена апавядаў, раз-пораз прыкладаючы руку да сэрца:

— Ты не паверыш, Верачка! Іду я па горадзе, а людзі са мной вітаюцца. То адзін, то другі, то трэці... Ціснуць руку, некаторыя ляпаюць па плячы, жыццём цікавяцца...Твары свецяцца ці, наадварот, засяроджаныя, іншым разам — сярдзітыя... Калі яшчэ такое было? Асобных знаёмых, прызнаюся табе, нават і не пазнаў. Каб яшчэ не падумалі, што нос задраў. Аказваецца, яны, людзі, аб нечым нетаропка клапоцяцца, заўважаюць адзін аднаго, спыняюцца, дзеляцца планамі і навінамі... Ёсць сярод іх і мае знаёмыя ... А я і забыўся даўно пра іх... Ё маё, а!.. Калі ж увесь час у машыне — толькі наперад глядзіш, на дарогу... Можа, часцей трэба пехам хадзіць, як думаеш?

Верачка ўсміхнулася і кіўнула мужу — падтрымала. А заадно і павіншавала яго з такім адкрыццём.

## НАШ ПРЫГАЖЭЙШЫ

Так атрымалася, што вёска ў адзін і той жа час папоўнілася трыма новымі жыхарамі: нарадзіліся дзве дзяўчынкі і хлопчык. Было гэта ў сярэдзіне сямідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, а прыгадалася сёння, калі патэлефанаваў з Мінска малодшы брат Воўка і мы пагаманілі пра мінулае жыццё нашай малой радзімы. Сёння, вядомая рэч, такое і ў добрым сне не прысніцца — каб трое новых жыхароў, ды яшчэ на адным тыдні... Справа вядомая: амаль няма каму працягваць ў Іскані род чалавечы. Састарэла вёска, на месцы былых хат раскашуе хмызняк. Зачыненыя паштовае аддзяленне, фельчарска-акушэрскі пункт. А будынак васьмігодкі нават разбурылі на дровы. На месца школы былая дырэктарка, а сёння ўжо нябожчыца Галіна Сцяпанаўна Стасевіч-Шульга, паспела прыцягнуць аднекуль валун, на якім сама ж напісала фарбай: тут была школа. І ўказала гады яе «нараджэння» і «смерці». Дарэчы, у яе, у школы, быў век не кароткі — 90!

Хацелі, кажуць, і краму зачыніць, але апошнія жыхары вёскі не далі зрабіць гэтага — сталі грудзьмі.

Неяк ехаў паблізу ад крамы і ўбачыў прадаўшчыцу, якая сядзела на лавачцы і грэлася на сонейку. Чакала, мабыць, пакупнікоў...

А ў той час, калі ў вёсцы з'явіліся амаль адначасова тры новыя жыхары, Воўка быў першакласнікам. І адным з нованароджаных быў ягоны пляменнік Ігарок. І тады што ён зрабіў, дзівак малы? Пабег да двух іншых немаўлят, паглядзеў на іх, прыбег дахаты і гучна заявіў:

— А наш прыгажэйшы!

Сам Воўка пра гэта не помніць. Аднак, ведаю, любіць, калі яму нагадваюць пра той выпадак. Тады яго твар кранае цёплая ўсмешка: трэба ж было і сапраўды да такога даўмецца!..

## ЗА ПЕЧ!

Кацярына Іванаўна трымае шматлікую жыўнасць. Карова, парсючок, трусы, качкі, куры... Адзін час нават былі ў яе гаспадарцы індыкі, а потым неяк нібы самі па сабе звяліся. Зрэдчас яна ўспамінае і гэтых птушак, нават думае: можа, і яшчэ іх завесці. Аднак усё ж не рашаецца, калі ўспомніць, што тыя да людзей чапляюцца, асабліва да дзяцей, якія, безумоўна, і самі не супраць пазабаўляцца з індыкамі. А то і на агарод індыкі пераляцяць праз парканчык, шкоды наробяць. Ну іх!

Муж іншы раз папракне Кацярыну Іванаўну:

— Чаго нам, старая, не хапае? Стварэм для сябе толькі лішні клопат. Пара ўжо і адпачыць. Давай будзем адных курэй трымаць? Усё ж цяпер можна купіць у краме. Ці нам пенсіі не хопіць?

Аднак старую не можа нізашто ўгаварыць, тая адно заяўляе шторaз:

— А тады дзеці хіба да нас прыедуць, калі не будзе чаго ўзяць? Забудуць — як і не ведалі!..

Муж не пагаджаецца, сарамаціць нават жонку, што пра сваіх дзяцей так кепска думае.

Нядаўна два сыны і дачка з зяцем прыехалі з горада на свежыну. Кацярына Іванаўна рада і не рада іх прыезду. У яе жыцці дзень, калі будуць калоць парсюка, самы няшчасны, бадай што. Тады яна не ведае, чым заняцца. Мітусіцца, усё з рук валіцца. А рукі тыя не ведае, куды схаваць — ці пад фартушок, ці сашчэпіць, каб не выдавалі яе хваляванне, на грудзях...

Нарэшце, калі прыходзіць са стрэльбай аднавясковец Рыгор, муж глядзіць на жонку, махае рукой у бок ганка і загадвае:

— За печ!

Кацярына Іванаўна ўздыхае і моўчкі туды хаваецца. Пазней яна чуе стрэл, хоць, здавалася б, вушы шчыльна затуляе далонямі, але дзе там схаваешся ад яго!.. Усхліпвае, выцірае слёзы. І не адразу выходзіць на падворак.

Хоць і ведае, для чаго гадуе парсючка, аднак ніяк не можа прывыкнуць, што некалі прыйдзе са стрэльбай сусед. Шкада жывое. І як шкада — пра гэта ведае толькі яна адна... А растлумачыць, чаму так — у каго б папытаць, а, людзі?.. Хто падкажа?..

**Васіль ТКАЧОЎ.**



Пласты гісторыі

# ЗАХАВАЛІСЯ НАВАТ КАНСЕРВЫ

## Раскапалі казарму часоў Першай сусветнай вайны

**У Альпах у выніку глабальнага пацяплення адтала казарма часоў Першай сусветнай вайны. У ёй захаваліся вопратка, паштоўкі і нават кансервы таго часу. Пра гэта паведаміла Daily Mail.**



Як стала вядома, у казарме жылі 20 салдат, якія хаваліся ад надзвычай халодных начэй італьянскіх гор. Мужчыны з аўстра-венгерскай арміі ўдзельнічалі ў жорсткіх баях з італьянскімі войскамі ў бітве, вядомай як Белая вайна, якая скончылася ў ліпені 1918 года.

Пасля трох з паловай гадоў канфлікту драўляныя баракі, якія знаходзіліся ўнутры пячоры на вышыні больш за 2,7 кіламетра, былі зачынены і цалкам замерзлі.

Толькі цяпер, калі сышоў лёд, прытулак раскапалі і ачысцілі. Унутры знайшлі газеты, кансервы, саламяныя ложкі, вопратку і ліхтары, а таксама рэшткі жывёл, з'едзеных людзьмі, якія калісьці жылі ў ім.

Знойдзеныя рэліквіі будуць выстаўлены ў новым музеі горада Бармія ў Ламбардыі ў 2022 годзе.

Біялогія з анатоміяй

# ЗЛОСНЫ, ЯК САБАКА

## Названыя самыя агрэсіўныя пароды гэтых жывёлін

**Маленькія жывёліны з большай верагоднасцю будуць паводзіць сябе агрэсіўна, чым сабакі сярэдняга і буйнога памеру.**

Даследчыкі вывучылі асаблівасці больш за 20 пародаў жывёлін, каб даведацца, як гэтыя аспекты ўплываюць на схільнасць дамашніх улюбёнцаў да агрэсіўных паводзін у адносінах да людзей.

Навукоўцы з універсітэта Хельсінкі правялі даследаванне больш за 9000 хатніх жывёлін, паведамляе Scientific Reports. У яго ходзе былі выяўлены асобныя якасці сабакі, якія ўплываюць на яго схільнасць да агрэсіўных паводзінаў у дачыненні да людзей.

Падчас эксперыментаў высветлілася, што маленькія сабакі з большай верагоднасцю будуць паводзіць сябе агрэсіўна, чым жывёлы сярэдняга і буйнога памеру. Але з-за сваіх «габарытаў» яны часта не разглядаюцца як пагрозлівыя, і таму іх дрэнныя паводзіны застаюцца па-за ўвагай. Даследаванне таксама паказала, што сабакі больш агрэсіўныя, чым сучкі, і іх стэрылізацыя не аказвае тут ніякага ўплыву.

Навукоўцы выявілі, што вопыт гаспадара сабакі таксама ўплывае на верагоднасць агрэсіўных паводзін гадаванца, прычым першыя сабакі пачаткоўцаў-уладальнікаў хатніх жывёлін з большай верагоднасцю будуць паводзіць сябе агрэсіўна. Даследаванне таксама паказала, што сабакі, якія больш кантактуюць з іншымі, паводзяць сябе дружалюбна.

Навукоўцы адзначаюць, што парода сабакі — гэта фактар, які ўплывае на агрэсіўнасць паводзін больш, чым любая іншая пераменная, за выключэннем узросту.

Каго мы бачым!

# ПЕРАБЛЫТАЛІ СКРЫНКІ...

## У Данііі выпадкова знайшлі астанкі вікінгаў

**Навукоўцы прыйшлі да высновы, што, хутчэй за ўсё, астанкі належалі двум сталым мужчынам.**

У Нацыянальным музеі Данііі выявілі чалавечыя астанкі са знакамітага кургана Б'ерынгхея, які адносіцца да эпохі вікінгаў. Пра гэта праінфармавала N+1.

Як паведамляецца, знойдзеныя яшчэ ў 1868 годзе косткі з рэшткамі тканак больш за сто гадоў лічыліся згубленымі. Верагодна, з-за памылкі работнікаў музея доўгі час гэтыя знаходкі захоўваліся ў няправільна падпісанай скрынцы.

Агульная захаванасць костак аказалася дрэннай, ні адна з іх не ацалела. Вылучыць ДНК з такога матэрыялу аказалася немагчыма. Аднак навукоўцы прыйшлі да высновы, што, хутчэй за ўсё, астанкі належалі двум сталым мужчынам.

Адзначаецца, што ў 1868 годзе пры раскопках кургана Б'ерынгхея ў вёсцы Мамен у Ютландыі археолагі выявілі адно з самых знакамітых дацкіх пахаванняў эпохі вікінгаў. Гэта багатае пахаванне вядомае сваімі шматлікімі і добра захаванымі рэчамі з шоўку, золата і серабра. Асаблівую вядомасць атрымала жалезная сякера, інкруставаная серабром. Аднак чалавечыя астанкі з кургана зніклі з калекцыі Нацыянальнага музея Данііі больш за сто гадоў таму.

Нябачная пагроза

# КАМЯНІ З ВАДЫ

## Агучана папярэджанне аб небяспецы мінералкі

**Штодзённае ўжыванне мінеральнай вады ў вялікіх колькасцях можа прывесці да парушэння водна-салявога абмену ў арганізме, заявіла расійскі мікрабіёлаг і выкладчык біяхімii Валянціна Скараход.**

Паводле слоў спецыяліста, спажыванне мінеральнай вады ў колькасці 200 мілілітраў у дзень будзе карыснае і дзецям, і дарослым з-за ўтрымання магнію, які мы не атрымліваем у дастатковай колькасці са звычайнай пітной вады. Аднак піць толькі мінеральную ваду на працягу дня не варта, дадала яна.

«З-за таго, што ў ёй утрымліваюцца растваральныя солі, пры штодзённым ужыванні ў вялікіх колькасцях яна можа выклікаць парушэнне водна-салявога абмену ў арганізме. Спачатку гэта можа праяўляцца з'яўленнем ацёкаў, а ў далейшым можа ўскладніцца і ўтварэннем пяску або камянёў у нырках», — прыводзіць «РІА Навіны» словы Скараход.

А дыетолаг, доктар медыцынскіх навук Міхаіл Гінзбург распавёў, што не варта піць мінеральную ваду ў гарачыню, паколькі арганізм страчвае вельмі шмат вадкасці з выдыханым паветрам, з потам, у выніку адбываецца канцэнтрацыя ўнутраных вадкасцяў, напрыклад, мачы або жоўці. На гэтым фоне магчымае ўтварэнне камянёў.

Паводле яго слоў, вада павінна быць негазіраваная. Таксама ў яе можна класці лімон, імбір, рабіць розныя ягадныя морсы або зялёны чай. Галоўнае — не дадаваць у напоі цукар.

Тэхналогіі будучыні

# ЛЯТУЧАЕ ТАКСІ

## Яно можа пачаць вазіць пасажыраў ужо ў 2024 годзе

**Больш за 80 працэнтаў апытаных жыхароў Еўропы станоўча адносяцца да гарадской аэрамабільнасці — транспартнай сістэмы для перамяшчэння людзей па паветры. Платныя пасажырскія перавозкі на электрычных аэратаксі ў Еўропе, верагодна, пачнуцца да сярэдзіны дзесяцігоддзя. Пра гэта распавёў выканаўчы дырэктар Еўрапейскага агенцтва авіяцыйнай бяспекі (EASA) Патрык Кай, піша Flightglobal.**

Паводле яго слоў, улічваючы «дасягнуты добры прагрэс», камерцыйнае выкарыстанне такіх лятальных сродкаў, хутчэй за ўсё, пачнецца ў 2024-2025 гадах.

«Мы ў працэсе сертыфікацыі некаторых транспартных сродкаў, якія будуць выкарыстоўвацца для гарадской аэрамабільнасці (UAM), і мы разлічваем завяршыць сертыфікацыю да 2024 года... Можам затрымацца, але самі аўтамабілі, на нашу думку, могуць быць сертыфікаваныя да гэтай даты», — паведаміў Кай.

Сярод кампаній, якія імкнуцца вывесці на рынак свае электрычныя лятальныя сродкі з вертыкальным узлётам і пасадкай (eVTOL) да гэтых тэрмінаў, — Lilium і Volocopter.

Усяго каля дзясятка праектаў падало заяўкі на сертыфікацыю EASA, у тым ліку некалькі, якія прадстаўляюць беспілотную перавозку грузаў — так званыя дастаўчныя дроны. Пры гэтым, паводле слоў Кая, каб сур'ёзна казаць пра беспілотную, аўтаномную перавозку пасажыраў, спатрэбіцца яшчэ некалькі гадоў.

Плануецца, што першапачаткова пілоты транспартных сродкаў гарадской аэрамабільнасці павінны будуць мець ліцэнзію камерцыйнага пілота. Затым, вывучыўшы, як гэтыя апараты паводзяць сябе ў гарадскіх умовах, для іх выпрацуюць новую катэгорыю ліцэнзій.

Каб лепш зразумець стаўленне грамадства да новага транспарту, EASA ў пачатку гэтага года апытала каля чатырох тысяч чалавек у шасці гарадах: Барселоне, Будапешце, Гамбургу, Мілане, Парыжы і Эрэсунскім рэгіёне на мяжы Данііі і Швецыі, дзе размешчана частка Капенгагена.

Больш за 80 працэнтаў апытаных станоўча ставяцца да гарадской аэрамабільнасці, 71 працэнт гатовы скарыстацца такімі паслугамі. Асноўныя асцярогі рэспандэнтаў выклікала бяспека — як саміх транспартных сродкаў, так і іх уразлівасць да кібератак, а таксама ўздзеянне на навакольнае асяроддзе і магчымае шумавое забруджванне.

Таксама рэспандэнты лічаць такія лятальныя апараты найбольш карыснымі ў сферы экстраннай медыцынскай дапамогі і міжгародніх рэйсаў — пры ўмове даступнай цаны. Кай кажа, што агенцтва будзе выкарыстоўваць атрыманыя данныя для фарміравання правілаў «у адпаведнасці з успрыманнем і чаканнямі грамадзян».

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Брыгадзір 1-га ўчастка Марына БЕЗБАРОДЗЬКА праводзіць на полі ўвесь дзень.

Раіса БОЙКА, начальнік цэха перапрацоўкі збожжа, на таку правярае ўраджай на вільготнасць.

Абеды ад Валянціны СЯРЧЭНІ механізатары з'ядаюць з апетытам.

# Залучаныя на жніве

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзевяць камбайнерскіх экіпажаў зранку да прыцемкаў шчыруюць на рапсавых, з трыцікале, пшанічных і ячных палетках. Пажнуць адну культуру — перабіраюцца на іншую — спелую, густую, пад цяжкімі каласамі — ніву. Пакуль надвор'е спрыяе, механізатары не расслабляюцца, не адпачываюць, не трацяць ні хвіліны (хіба толькі на гарачы і смачны полудзень, вядома ж, пад адкрытым небам). Хутка набіраюцца сямітонныя бункеры, увішныя «МАЗы» і «газончыкі» падстаўляюць свае кузавы пад «хлебны» дождж. Збожжа транспартуецца з поля на ток, а на дварэ зернесушылкі ўтвараецца сапраўдная «горная сістэма».

Можна шмат расказваць пра кожнага ўдзельніка ўраджайнай бітвы на лучнікоўскіх палетках — механізатараў і вадзіцеляў, супрацоўнікаў МНС і раздатчыкаў абедаў, аграномаў і брыгадзіраў участкаў, работнікаў зернятока... — усе яны сумленна працуюць у сёлетняй уборачнай кампаніі...

Галоўны аграном Сяргей Савановіч раскрыў аграномічныя карты (цяпер можна): азімая пшаніца пасеяна на тысячы ста чатырнаццаці гектарах, азімы трыцікале — на трохсот дваццаці гектарах, рапс — на сямісот трыццаці...

— Сёлета рапс нас не падвёў: на трыццаць працэнтаў большы ўрадзіўся, чым леташні, а азімы ячмень дае 75 цэнтнераў на круг, — кажа аграном Сяргей Савановіч.

Перад тым як вярстаўся газетны нумар, я патэлефанаваў галоўнаму аграному і пачуў ад яго: «Наша жніво ўжо на самым экватары і амаль усе экіпажы наблізіліся, а то і перасягнулі тысячны рубеж».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
**(Больш здымкаў з ААТ «Аграфірма «Лучнікі» глядзіце на сайце «Звязды».)**

Камбайнер Аляксандр КЛЕВАНОВІЧ першы ў гаспадарцы намалаціў сваю тысячу тон. А серп яму патрэбен, каб даставаць асцё з жаткі камбайна.

Сваё трыццаціпяцігоддзе вадзіцель Сяргей СІДАРОК адзначае на жніўным полі.

Так утвараюцца хлебныя «горы».

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 19 августа 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
